Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — р. 60 к. • 3 • — р. 70 к. • 6 • — р. — к. • 1 год — р. — к. Зьмена адрасу і замацаваньне мясцовыя — 20 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкаровай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкаровай паперэд тэксту 1 р. — к. За радок шапкаровай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. даражэй. Зьмена тэрміну друку 10 проц. адлегу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 квадрат . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 • Беспрадметна і чырвонаармейцам за квадрат . . 15 • За кожны дадатковы . . 5 • Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАННЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 14 (2503) Пятніца 18-га студзеня 1929 г.

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б СКЛІКАЕЦЦА НА 19 СТУДЗЕНЯ 1929 Г. З НАСТУПНАЙ ПАВЕСТКАЙ ДНЮ:

1. АБ ПЯЦІГАДОВЫМ ПЛЯНЕ РАЗЬВІЦЬЦЯ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ Ў БССР (ДАКЛАД. Т. Т. ГАЛАДЗЕД, КАРКЛІН.)
2. АБ РЭГУЛЯВАНЬНІ РОСТУ ПАРТЫІ (ДАКЛАД. Т. ВАСІЛЕВІЧ)
3. АБ ХОДЗЕ ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ (ДАКЛАД. ТАВ. ХАЦКЕВІЧ),

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ГАМАРНІК.

Аманула вымушан пакінуць трон.

Новым аўганскім падышахам стаў брат Аманулы—Інаятула. Адносіны мяцежнікаў да новага падышаха невядомы. Бойкі за Кабул набылі вострую форму.

ЛЕНДАН, 15-I. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «З Нью-Дэлі (Індыя) атрыманы падрабязнасьці аб падзеях, якія выклікалі адмову Аманулы-хана ад трону. Выяўляецца, што ў нядзелю войска Аманулы было прымушана ачысьціць Хаседамскую даліну пад націскам мяцежнікаў. На працягу ночы правадыр мяцежнікаў Бача-Сакао ўвайшоў у даліну, дзе знаходзіцца Кабул, і абкружыў важную ў стратэгічных адносінах вёску, прыблізна за 3 мілі на захад ад Кабулу. Вёска гэтая, дзе знаходзілася штаб-кватэра войска Аманулы, была захоплена мяцежнікамі разам з вялікім гарнізонам і некаторраю колькасьцю гарматаў.

Учора мяцежнікі наступалі далей на Кабул і пасьля бамбардыровкі захапілі ўзвышша ля ваколіц горада. Тады Аманула адрокся ад трону і яго брат быў належным парадкам каранаваны. Потым група мул і рэлігійных правадыроў накіравалася в Кабулу ўстанавіць кантакт з мяцежнікамі, з якімі было ўтворана замірэньне. Учора Аманула быў яшчэ ў Кабуле.

Аўганскі генэральны консул у Дэлі паведамляе, што Аманула адмовіўся дабраховотна і прапанаваў у якасьці свайго наступніка свайго брата Інаятулу, з якім ён знаходзіцца ў прыязельскіх адносінах. Паведамляюць, што Інаятула карыстаецца давер'ем духоўніцтва.

* * *

ЛЕНДАН, 15-1. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Пэшавару: «Водлуг самых апошніх паведамленьняў з Кабулу, там пасьля зацішша распачаліся вялікага абхвату бойкі. Яшчэ невядома, як паглядзелі пляменьні на тое, што на трон сеў Інаятула».

Аўганская місія ў Парыжы аб каранаваньні Інаятулы.

ПАРЫЖ, 16-1. Аўганская місія ў Парыжы перадала ў друк паведамленьне, у якім закранае заўвагі некаторых газэт, што новы кароль Аўганістану Інаятула выяўляецца прыяцелем Англіі. Місія заяўляе, што новы аўганскі кароль перш за ўсё выяўляецца пасьлядоўным аўганскім нацыяналістам і намерен падтрымліваць найлепшыя дачыненьні з усімі чужаземнымі дзяржавамі, не аддаючы ніякае перавагі якой-небудзь з іх.

У гутарцы з «Чынгаз Трыбун» аўганскі паслаьнік у Парыжы Хабібулла Тарзі заявіў наступнае: «Цёмныя інтрыгі Англіі прымусілі паўстаць некаторыя плямёны проці Аманулы. Адная, такая палітыка ахоўвалася на няўдачу, бо Інаятула зусім не зьяўляецца зброяй у руках Англіі, якім яго спрабуюць намаляваць; ён такі-ж аўганскі патрыёт, як Аманула. І імкнецца перш усяго да незалежнасьці Аўганістану. Ён відаць, ён заняў трон пасьля прыцельскае згоды з Аманулаю, спадзяючыся такім парадкам супакоіць край і сарваць чужаземныя змовы. Аманула заставацца правадыром маладога Аўганістану, як заснавальнік шляхіх рэформаў, далейшае паступовае ажыцьцяўленьне якіх нічым ня можа быць прыпынена. Аўганістан абвінавачвалі ў тым, што ён аддае перавагу Расеі. Гэта байка. У сапраўднасьці Аўганістан знаходзіцца ў прыяцельскіх адносінах з СССР, бо да гэтага часу ад нашых дачыненьняў з расейцамі мы бачылі толькі добрыя вынікі. У той час, як з бо-у іншых мы бачым заўсёды тольні інтрыгі і напрыяцельскія намеры».

На сэсіі Лігі Барацьбы з Імпэрыялізмам.

КУК НА НЯПРАВІЛЬНАЙ ПАЗІЦЫІ.

БЭРЛІН, 16-1. У сваім дакладзе на сэсіі выканкому Лігі Барацьбы проці імпэрыялізму і прыгнечаньня калёніяльных народаў. Кук вострае крытыкаваў перамовы з Монтан наконт міру ў прамысловасьці і выступіў проці лібэральнага напрамку ангельскае рабочае партыі. Кук выказваўся за заснаваньне адзінага Інтэрнацыяналу прафсаюзаў, які павінен быць зьвязан з антыімпэрыялістычнаю Лігаю. Далей Кук выкрываў імпэрыялістычны характар Лігі Нацый і заклікаў да згуртаванага падтрыманьня і абароны Савецкага Саюзу праз прафсаюзы.

* * *

БЭРЛІН, 16-1. У Кельне адбылося чарговае пасяджэньне сэсіі выканкому Лігі Барацьбы проці імпэрыялізму і прыгнечаньня калёніяльных народаў. У пачатку пасяджэньня быў ухвалены прывітальны адрас савецкай дэлегацыі.

Далей Кук зрабіў даклад аб задачах прафсаюзаў у барацьбе проці імпэрыялізму. Кук заявіў: «Галоўнаю задачаю зьяўляецца падтрымка нашых таварышоў у СССР у іх будаўніцтве».

У спрэчках па дакладзе Кука першым выступіў прадстаўнік французкае унітарнае канфэдэрацыі працы Эжле, які падкрэсьліваў, што сапраўдная барацьба проці імпэрыялізму праводзіцца ў Францыі толькі камуністычнай партыяй і унітарнай канфэдэрацыяй. Нарэшце Эжле паведаміў, што унітарная канфэдэрацыя працы ўхваліла далучыцца да Лігі.

Тав. Мяльнічанскі выкрывае няўдачы патуг Кука.

БЭРЛІН, 16-1. У Кельне на пасяджэньні сэсіі выканкому Лігі Барацьбы проці імпэрыялізму і прыгнечаньня калёніяльных народаў цэнтральным пунктам зьявілася прамова Мяльнічанскага, які выступіў у спрэчках па дакладзе Кука аб задачах прафсаюзаў у барацьбе проці імпэрыялізму. Мяльнічанскі заявіў: „Капіталізм існуе ўмацаваўся і пры актыўнай дапамозе сацыял-дэмакратаў імкнецца дэзарганізаваць міжнародны рабочы рух. Я не згаджаюся з Кукам, які абмалёўвае рэфармістаў толькі як нязнак. У Кука яшчэ засталіся ілюзіі наконт становучае ролі ангельскае генэральнае рады прафсаюзаў. Разгром ангельскіх гарнякоў, ліквідацыя англа-расейскага камітэту, мондым (перамовы аб міры ў прамысловасьці) і інш. учынкі генэральнае рады—усё яшчэ не зьяўляюцца для Кука належнымі доводамі за тое, што ангельскія рэфармісты сьвядома выконваюць ролю здраднікаў. Праект Кука аб'яднаць ультра-правыя і ультра-левыя элементы рабочага руху ў адзіны баявы фронт проці імпэрыялізму пахне дзіцячаю наіўнасьцю. Імпэрыялісты спрабуюць падмануць масы новымі пацыфістскімі маневрамі, як канфэрэнцыяй аб разброеньні, пактам Келега і інш. У гэтым ім дзейна спрыяюць сацыял-дэмакраты. Адзіны край, які сапраўды жадае спакою, гэта Савецкі Саюз".

У адказе Мяльнічанскаму Кук заявіў, што „ён зусім не намерен абярнуць Лігу ў чырвоны Інтэрнацыянал".

Сэсія горача вітае савецкую дэлегацыю.

ДАКЛАД АБ АНТЫІМПЭРЫЯЛІСЦКІМ РУХУ Ў ЛАЦІНСКАЙ АМЭРЫЦЫ.

БЭРЛІН, 15-1. Перад тым, як сэсія выканкому Антыімпэрыялістычнае Лігі ў Кельне перайшла да парадку дню выдатныя сябры Лігі ад імя выканкому Лігі прывіталі дэлегацыю савецкіх прафсаюзаў ня толькі як прадстаўніцу 12-ці мілёнаў арганізаваных працоўных СССР, але і як прадстаўніцу ўсіх працоўных Савецкага Саюзу—адзінага краю, у якім нацыянальнае пытаньне поўнасьцю вырашана рэвалюцыяй.

Далей сэсія заслухала даклад прафесара Гольшмідта аб становішчы антыімпэрыялістычнага руху ў краёх Лацінскае Амэрыкі. Дакладчык даў маляўнак бурнага заўзяцьня асобных краёў Лацінскае Амэрыкі капіталам Злучаных Штатаў. Водлуг слоў дакладчыка, Англія адіснута ў краёх Лацінскае Амэрыкі на абарончыя пазыцыі: канфлікт між Балівіяй і Парагваем выбухнуў выключна ў выніку антаганізму між імпэрыялізмам Англіі і Злучаных Штатаў, які выўкільна павінен выклікаць больш значныя стычкі. Антыімпэрыялістычны рух у Лацінскай Амэрыцы ахапляе ўсё большыя гушчы жыхарства.

Дэманстрацыі ў Бэрліне і Празе

ПАМЯЦІ ЧЫРВОНЫХ КАРЛА І РОЗЫ.

ПРАГА. З прычыны ўгодак забойства Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург, учора ў Празе адбыліся дэманстрацыі рабочае моладзі. Дэманстранты вышлісе перад будынкам рэдакцыі сацыял-дэмакратычнага органу «Право Люду»; камуністы ны дэпутат Грушка выступіў з прамовою, у якой падкрэсьліў ролю нямецкае сацыял-дэмакратыі ў забойстве Лібкнэхта і Люксэмбург.

БЭРЛІН, 16-1. Учора ўвечары ў зьвязку з 10-мі ўгодкамі забойства Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург рабочая моладзь у колькасьці 1.500 чалавек наладзіла дэманстрацыю. На плянту, дзе знаходзіцца рэдакцыя «Форвэрто», гаварылася прамовы 3 памашканьня «Форвэрто» было паведамлена паліцыі, якая арыекавала на некалькіх грузавіках і атакавала дэманстрантаў, пусьціўшы ў ход гумовыя кіі. Некалькі чалавек паранена.

ІМПЭРЫЯЛІСТЫ УЗБРОЙВАЮЦЦА,

не зважаючы на існаваньне пакту Келёга.

Сэнат Амэрыкі пасьля ратыфікацыі парыскага пакту перайшоў да абмеркаваньня суднабудаўнічае праграмы.—Францыя пачынае шырокае будаваньне крэйсэраў і падводных лодак.

Пакт Келёга ў сэнаце Зл. Штатаў.

ВАШЫНГТОН, 16-1. Сэнат Злучаных Штатаў ратыфікаваў пакт Келёга 85-ю галасамі проці аднаго. Былі былі абвешчаны вынікі галасаваньня, дык сэнатар Брукхарт зьвярнуўся з прамоваю да сэнату, у якой заявіў, што Злучаныя Штаты і Савецкі Саюз вызначаюцца першымі вялікімі дзяржавамі, якія ратыфікавалі пакт Келёга. Брукхарт выказаў надзею, што абедзьве дзяржавы будуць імкнуцца да зьнішчэньня вайны ва ўсім сьвеце.

Першым пытаньнем на парадку дню сэнату пасьля ратыфікацыі пакту Келёга стаіць пытаньне аб законапраекце марское суднабудаўнічае праграмы, якая прадугледжвае пабудову 15 крэйсэраў.

Водгукі на ратыфікацыю пакту Амэрыкай.

„ТАН" У ЗАХАПЛЕНЬНІ „АД ПРАВАЛУ МАНЗЎРАЎ МАСКВЫ".

ПАРЫЖ, 16-1. Вітаючы ратыфікацыю пакту Келёга сэнатам Злучаных Штатаў, «Тан» піша: «Пажадана, каб хутчэй ратыфікавалі пакт іншыя дзяржавы, бо яно патрэбна для надання яму правамоцнасьці. Такім парадкам, маневр, ужыты савецкім урадам в мэтаю адмежаваць Польшчу ад іншых дзяржаў, будзе ўжо залішні».

Пэртынакс у «Эко дэ Пары» выказваецца прыблізна таксама. Ён ставіць сэнату Злучаных Штатаў у заслугу тое, што апошні «вызваліў Эўропу ад праэкту і маневраў Масквы, пабудаваных на меркаваньні, што ратыфікацыя затрымаецца, або зусім не адбудзецца».

Францыя будуе новыя крэйсэры.

ПАРЫЖ. 15-1. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Галасамі ўсіх партый проці камуністаў і сацыялістаў палата дэпутатаў дазволіла ўраду ажыцьцёвіць другую частку суднабудаўнічае праграмы, якая прадугледжвае пабудову аднаго крэйсэра, 6-ці контрмінаносцаў, 6-ці падводных лодак, аднае падводнае лодкі для ўстаноўкі мін і 2-х пасыльных суднаў».

МІЛІЯРД ФРАНКАЎ НА НОВЫ ВАЙСКОВЫ ФЛЁТ.

ПАРЫЖ. 16-1. Учора сэнат абмяркоўваў інтэрпэляцыю Лемэры наконт пакту Келёга. Інтэрпэлянт, між іншым, падкрэсьліў, што сэнат Злучаных Штатаў адначасна з ратыфікацыяй пакту Келёга рыхтуецца абмяркоўваць вялікую праграму вайскова марскога будаўніцтва.

У палітычных колах адзначаюць цікавую выпадковасьць: французкая палата учора разглядала таксама і законапраект аб пабудове новых вайсковых суднаў. Гэтыя суднаы, якія ўваходзяць у другую чаргу агульнае праграмы французкага вайсковамарскога будаўніцтва, маркуецца пачаць будаваць з лістпа 1929 году. Агульны кошт запраектаваных суднаў складзе блізка 989-ці мілёнаў франкаў, якія будуць выдадзены на працягу 5-ці гадоў (з 1929 да 1933 году). Проці праэкту выступіў сацыяліст Рэйно. Рэйно заявіла, што ігнараваньне такое прагавары пад штурхіце і іншыя дзяржавы да зьвышэньня ўзброеньня на моры.

З адказам выступіў марскі міністэр Лейг, які падкрэсьліў, што прадугледжаныя праэктам сумы ўжо ўхвалены палатаю і сэнатам, бо ўключаны ў бюджэт 1923 году. Зараз справа ідзе толькі наконт тыпу суднаў, намечаных да пабудовы ў бліжэйшым годзе.

Інтэрпэляцыя дэпутата Лемэры аб пакце Келёга.

БРЫЯН «НЕ ПЯРЭЧЫЦЬ» ПРОЦІ ПАДПІСАНЬНЯ ПРАТАКОЛУ СССР НА ПОЛЬСКІХ УМОВАХ.

ПАРЫЖ, 16-1. Блізкі да радыкалаў дэпутат «дэмакратычнае левае» Лемэры выступіў у сэнаце з запытаньнем аб замежнай палітыцы ўраду. Лемэры заявіў, што пакт Келёга паслабіў прэстыж Лігі Нацый і ўмацаваў аўтарытэт Злучаных Штатаў. Адным з адмоўных вынікаў пакту Келёга прамоўца лічыць упарадкаваньне Балівійска-Парагвайскага канфлікту без ведама Лігі Нацый. Другім адмоўным вынікам пакту ён лічыць савецкую прапанову Польшчы, якую прамоўца называе „небясьпечнай і шматзначнай падзеяй" і заўважае, што СССР мяркуе пабудаваць на пакце Келёга цэлую сыстэму прапаганды, проста накіраваную проці Лігі Нацый і яе мэтадаў.

Адказваючы на прамову Лемэры, Брыян заявіў: «Лемэры гаворыць: „паглядзеце, якое небясьпечнае ўжыванне ўжо зрабілі з пакту Келёга некаторыя краі; паглядзеце, як саветы захапілі пакт у свае рукі, спрабуючы інтрыгаваць проці Польшчы». Але, паглядзеце, якая пашана пакту Келёга в боку народу, які з такою гэроіяй адносіцца да органаў спакою, якія зарадзіліся ў нетрах буржуазнае грамады. Гэта сапраўды пашана, калі толькі ня хітрасьць. Мы, абмеркаваўшы, прышлі да пераканаьня, што ў даным выпадку пакт можа набыць характар пакту аб ненападзе, які Польшча сама прапанавала Расеі, але пры умове, калі гэты пакт не абмяжуецца Польшчай і Расеяй, а будзе распаўсюджан на ўсе краі Эўропы, якія непасрэдна мяжуюць з Расеяй, пачынаючы з Румыніі і канчаючы Балтыцкімі дзяржавамі. Я мяркую, што перамовы закончацца пасьпяхова, і што ўсе гэтыя краі падпішуць прапанаваную згоду. Я ня бачу, чаму трэба шкадаваць аб гэтым".

НА ШТО НЯМЕЧЧЫНЕ ПАТРЭБНЫ ПАНЦЫРНІКІ.

СЭНСАЦЫЙНАЯ ЗАЯВА МІНІСТРА ГРЭНЕРА.

БЭРЛІН, 16-1. У нямецкіх палітычных колах выклікаў сэнсацыю агалошаны ў лёнданскай часопісі «Рэв'ю оф Рэв'юс» даверыцельны мэмарандум нямецкага вайсковага міністра Грэнера аб пытаньні наконт пабудовы панцырнага крэйсэра. Мэмарандум заявачае, што нямецкія баявыя сілы могуць быць патрэбны як проці спроб тэрытарыяльнага паслабленьня Нямеччыны, якое мэмарандум і надалей лічыць магчымым з боку Польшчы, так і для абароны нямецкага нейтралітэту на выпадак канфлікту, у якіх будуць удзельнічаць заходнія дзяржавы. Мэмарандум прызначае панцырнікам ролю аховы Балтыцкага ўзьбярэжжа, прычым панцырнікі павінны таксама «нейтралізаваць перавагу моцнага баявога флёту СССР».

Плынь у Румыніі за падпісаньне савецкага пратаколу.

ВЕНА, 16-1. Як паведамляюць з Бухарэсту, ратыфікацыя пакту Келёга сэнатам Злучаных Штатаў выклікала здаволеньне ў румынскіх урадавых колах, якія спадзяюцца, што гэтая ратыфікацыя выкліча «няўдачу» савецкае прапановы Польшчы. Аднак, некаторыя сябры ўраду, між іншым, міністр земляробства Міхалакі, лічаць, што трэба выкарыстаць усе магчымасьці для згоды в СССР, каб ліквідаваць напружанае становішча на Дністры».

* * *

ВЕНА, 16-1. З Бухарэсту паведамляюць, што румынскі друк вымушчае шырокія выняткі з другое ноты Літвінава Польшчы. Прыяцельскія ўраду «Адэвэрул» і «Дымінэца» заяўляюць, што Румынія ня мае падставы адмаўляцца ад падпісаньня пратаколу, калі Савецкі Саюз, водлуг сэнсу ноты Літвінава, сапраўды адмаўляецца ад упарадкаваньня бесарабскага пытаньня ваеннымі сродкамі.

Орган румынскага рабоча-сялянскага блёку «Інаінто» заклікае рэвалюцыйны пралетарыят Румыніі крок за крокам выкрываць махінацыі румынскае буржуазеі проці Савецкага Саюзу і праводзіць барацьбу проці яе ваенных падрыхтовак.

Адказ Эстоніі і Латвіі на прапанову Літвы.

РЫГА, 16-1. Водлуг газэтных паведамленьняў, латвійскі і эстонскі ўрады рыхтуюць супольны адказ на літоўскую прапанову далучыцца да прапанаванага СССР пратаколу аб наданьні правамоцнасьці пакту Келёга.

Пілсудзкі зусім ня лічыцца з соймам.

МАГЧЫМЫ НОВЫЯ ВОСТРЫЯ СТЫЧКІ між СОЙМАМ І ЎРАДАМ. Масавыя арышты западозраных у камунізьме.

Напружаныя варункі ў сойме.

ВАРШАВА, 16-1. Сэсія сойму адналіся ўчора ў вельмі напружаных варунках. З аднаго боку, гэтаму спрыяла дэманстрацыйная адмова Пілсудзкага пасьлаць сваіх прадстаўнікоў у бюджэтную камісію сойму на абмеркаваньне вайсковага бюджэту. З другога боку, напружанасьці ў сойме спрыялі распаўсюджаныя ў апошні час чуткі наконт падрыхтоўкі так званае палкоўніцкае групы (групы Славэка) да дзяржаўнага перавароту ў выпадку няўдачы перагляду вайсковага бюджэту парляманцкім парадкам.

Учора сойм фармальна распачаў перагляд канстытуцыі. Пакуль-што ніякіх канкрэтных праэктаў зьмен канстытуцыі сойму не пададзена. Левыя групоўкі пакуль-што выступаюць проці пагоршаньня канстытуцыі салідарна. Пілсудзкі спадзяецца ў справе перагляду канстытуцыі на дапамогу правых груповак.

Вельмі характарным было выступленьне на пленуме сойму лідэра ППС Лібэрмана, які заявіў, што права сойму кантраляваць дзяржаўны бюджэт на справе даўно ўжо зьнішчана. Урад даўно ўжо дазваляе сабе рабіць перавыдаткі ў бюджэце на сотні мільёнаў і ня думае нават прасіць сойм зацьверзіць гэтыя перавыдаткі. Гэта раўназначна скасаваньню канстытуцыі і правоў парляманту.

У зьвязку з сучаснымі варункамі ў пытаньні наконт канстытуцыі, у соймавых колах лічаць магчымымі новыя вострыя стычкі між урадам і соймам.

Новыя арышты.

ВАРШАВА, 16-1. Газэты паведамляюць пра новыя масавыя арышты ў Польшчы. За апошнія дні арыштавана блізка 100 чалавек, западозраных у камуністычнай дзейнасьці.

Арышт 100 камуністаў у Дамброўскім басэйне.

«Газэта Варш.» (№ 16) паведамляе, што ў Дамброўскім басэйне выкрыта вялікая камуністычная арганізацыя і арыштавана звыш 100 асоб.

Справа Кернік-Стпічынскі.

14 студзеня павінна была разглядацца ў Варшаўскім акруговым судзе справа рэдактара паўурадавай газэты «Глос Правды» п. Стпічынскага, абвінавачанага ў сваёй газэце пасла сойму і б. міністра Керніка Стпічынскі і на гэты раз не зьявіўся ў суд. а ад яго імя адвакат прадставіў пасьведчаньне доктара аб хваробе п. Стпічынскага. Гэта ўжо мае дзесяты выпадак няяўкі сапраўднага рэдактара ў суд.

Наступ на Валынь.

«Украінскі Вісти» (№ 81) паведамляюць, што апошнімі часамі распачалася на Украіне (у Польшчы) кампанія проці украінскіх прыватных гімназій на Валыні. Гімназіі ў Луцку закідаюць камунізм і ўлада ўжо пачала сьледзтва проці дырэктара гэтай гімназіі Ўласоўскага, дамагаючыся ад яго каб ён пакінуў свае месца. Тое самае робіцца і з гімназіяй у Роўным, якой закідаюць, што не вучні вышэйшых клясаў водуць антыдзяржаўную прапаганду. Паліцыя пачала ўжо дапытваць усіх западозраных вучняў.

Зацьверджаньне канфіскацыі.

Акруговы суд у Вільні на апошнім сваім гасподарчым пасяджэньні з цьверзіў канфіскацыю газэты «Вільнёўс Рытойнёс».

Нарада ў Масьціцкага з удзелам Патэка

АБМЯРКОЎВАЛІСЯ ПЫТАНЬНІ ГАНДЛЮ З СССР.

ВАРШАВА. 16-1. Польскі паслаьнік у Маскве Патэк меў гутарку учора з міністрам прамысловасьці і гандлю Бяткоўскім, пасьля чаго быў прыняты прэмэр-міністрам Бартэлем, а потым—прэзыдэнтам рэспублікі. Як паведамляе «Экспрэс Поранны», на гэтых нарадах абмяркоўвалася пытаньне наконт польска-савецкіх дачыненьняў, між іншым, наконт праблемы эканамічных узаемадачыненьняў між абодвымі краямі. З прычыны таго, што на ўчарашніх нарадах пытаньне яшчэ ня было канчаткова ўладжана, Патэк адкладзе свае падарожжа ў Маскву да 19-га студзеня.

Вакол крывавых падзей ля Львову.

ВАРШАВА. 16-1. У зьвязку з расстрэлам сялян у вёсцы Бацяцічы каля Львову, дэпутат сельробу Бальніцкі затрабаваў назначыць спэцыяльную камісію, каб расьледваць гэтую справу. Аднак, сойм большасьцю галасоў адхіліў гэтую прапанову, перадаўшы справу на разгляд адміністрацыйнае камісіі сойму. Прадстаўнік эн-дэкаў заявіў, што віноватых у крывавых падзеях „трэба шукаць сярод тых, хто тут скардзіцца на пакрыўджаньне сялян».

Як паведамляюць, апроч трох сялян, якія загінулі на месцы, памёр ад ран яшчэ адзін селянін. Пры пахаваньні ахвяр расстрэлу адбылася вялікая дэманстрацыя украінскага сялянства.

ЗЬВЕРСКАЕ КАТАВАНЬНЕ НАД ТАВ. РАКОШЫ.

ЗЬНЯВОЛЕНЫ Ў ПАДЗЁМНЫМ КАЗЭМАЦЕ, НАПОЎНЕНЫМ ВАДОЮ.

ВЕНА, 16 1. Паведамляюць, што ў выніку дыпэкцыі цэнтральнага судапошчыка астрогу пераляжыла ліст Матыяса Ракошы з апісаньнем суровасьцяў астрожнага рэжыму. Ракошы пядаўна засуджан на тыдзень зьняволеньня ў карцары астрогу. Пасьля гэтага пакараньня Ракошы на 3 месяцы пазбаўлен права перапіскі, спатканьняў, атрыманьня кніг; харчовы паёк яго зьменшаны на трэцюю частку. Ракошы піша, што тыдневае зьняволеньне ў падзёмным перапоўненым водою казэмаце вельмі дрэнна адбілася на здароўі.

У Саюзе ССР.

Патрэбна яшчэ большая актыўнасьць прафсаюзаў У КАМПАНІІ ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

(На нарадзе пры УЦСПС).

МАСКВА, 16-га студзеня пры УЦСПС адбылася чарговая нарада для вывучэньня абхвату ўдзелу прафарганізацый у кампаніі перавыбараў саветаў. Тав. Дабравольскі, адчыняючы нараду, зазначыў, што актыўны ўдзел прафсаюзаў у перавыбарах саветаў фактычна разгарнуўся, пачынаючы са сьнежня. Аднак, і зараз трэба прывацаць удзел прафсаюзаў у кампаніі перавыбараў саветаў слабым. Апошнія весткі сьведчаць, што прафарганізацыі мабілізавалі значную колькасьць працаўнікоў для правядзеньня кампаніі на месцах, але далёка ня ўсе райёны маюць належную актыўнасьць у гэтай працы.

Нарада далей заслухала падрабязныя даклады ЦК саюзаў мэталёўцаў і сельска-гаспадарчых рабочых, а таксама кароткія паведамленьні некаторых іншых ЦК саюзаў аб ходзе кампаніі у цэнтры і на месцах. З заслуханых паведамленьняў выявілася, што саюзы ў гэтую кампанію зьяўляюцца значна больш актыўнымі, чымся ў мінулыя кампаніі перавыбараў. Тэкстыльшчыкі паслалі рабочыя брыгады ў райёны. Сародняга Паволжжа, Брэнск, Дагестан і Кастраму. Маскоўскі губадзел тэкстыльшчыкаў прыстасаваў да часу перавыбараў адчыненьне ясьляў, радыё-установак, пасылку кніжак за вёску і інш.

Прадстаўнік ЦК саюзу горнарабочых зазначае, што процант удзельнікаў перавыбарчых сходаў значна перабольшае папярэднія кампаніі перавыбараў.

Тав. Дабравольскі, падрахоўваючы выступленьні ўдзельнікаў нарады, адзна чае, што кулацкаму наступу павінен даць адпор ня толькі саюз сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, але і ўсе саюзы, якія налічваюць у вёсцы блізка 40 процантаў сваіх сяброў. Саюзы павінны зварочваць больш увагі на правядзеньне кампаніі на вёсцы, пасылаючы туды лепшыя свае сілы. Патрэбны не абежнікі і агульныя дырэктывы, а канкрэтная праца ў асобных райёнах, дзе гэтая праца слаба разгорнута. Саюзы павінны шырэй выкарыстаць для правядзеньня кампаніі культпрацу—клюбы, чырвоныя куткі, бібліятэкі і г. д.

СЕЛЕТНЯЯ ПАБУДОВА НОВЫХ ЧЫГУНАК.

МАСКВА. У калегіі НК Шляхаў абмяркоўвалася пытаньне аб фінансаваньні пабудовы чыгуначных калёін і веткаў, пабудаваньне якіх прадугледжана ў бюджэце 1928 29 г. У гэтым годзе будзе скончана пабудова некаль ких чыгунак, якія маюць вялікае эканамічнае значэньне для тых райёнаў СССР, якія гэтым чыгункам прыдасцца абслугоўваць. Да гэтае групы чыгунак, належаць калёіны Троіцк-Орск, Новабеліцы-Прылукі, Унеча-Варажба, Аксстадава Днепрапятроўск, Кіржач - Арэхава, Ахал-Сэмакі-Зугдзіды, Ільінскі пагост-Ягорэў і Вінадзельня-Дзіўнае. Калегія зварочвае ся да вышэйшых інстанцый з хадайніцтвам аб дадатковым асігнаваньні ў 3-м квартале сьветнага гаспадарчага году 1.550.000 рублёў на пабудову лініі Кіржач-Дышамбэ; гэта дасьць магчымасьць пракласьці чыгунку да Дышамбэ ўвосень.

Працы на Днепрабудзе перавысілі праграму.

ЗАПАРОЖЖА, 16-1. Намесьнік галоўнага інжынэра Днепрабуду Ротэрт выступіў на вытворчай канферэнцыі будаўнікоў Днепрабуду з дакладам аб выкананьні працы за 1927-23 аператыўны год і пэрспэктывах на 1928-29 год. Да 1 кастрычніка мінулага году, паведаміў інжынэр Ротэрт, на будаўніцтва выдадзена 62200000 або 31.2 проц. з агульнага каштарысу. На гідрастанцыі ў адносінах да гадавога каштарысу за 1927-28 год мерквалася выканаць 4 проц. працы, а выканана—4,6 проц.; на заставах мерквалася выканаць 3.6 проц., а выканана 4,8 проц., на вэрабычках—12,5 проц., а выканана 77,9 проц. Такім парадкам, у адносінах да гадавога праграмы Днепрабуд ідзе вышэй плану.

Новы індустрыяльны горад Дзяржынск.

НІЖНІ НОЎГАРАД, 16-1. Расьцянінскі рабочы райён робіцца індустрыяльным цэнтрам губэрні. У даны момант, згодна пастановы ўраду, замест дробных пасёлкаў ажыцьцяўляецца пабудова адзінага рабочага гораду. Будуць пабудаваны дом саветаў, тэатр, тэхнікум, 3 школы, 2 амбулятоўкі, фабрыка-кухня, пошта і вадаправодзі. Агульны кошт будаўніцтва дасягае 4630000 рублёў.

Рабочыя хадайнічаюць, каб новы горад назваць Дзяржынскам.

Дзікая расправа кулака над бедняком.

РАЗАНЬ, 16-1. У вёсцы Дзелецева, Адрасеўскае воласьці, Раскага павету кулак Якуб Гураў разам з сваім братам вылягчаў бедняка Мілюкіна. Мілюкін, які ня меў каня, прымушан быў барыстацца інвэнтаром Гурава і за гэта аддаваць палову свайго ўраджаю. Між Мілюкіным і Гуравым быў утворан угавор, згодна якога ўвесь ураджай дзяліўся папалам. Надоечы Гураў убачыў на гумне Мілюкіна мібыта больш лік снапоў, чымся яму належала згодна ўгавору. Зьявіўшыся ўночы ў хату Мілюкіна, Гураў вылягчыў Мілюкіна.

Прыём у т. Рыкава.

МАСКВА, 16-I. У панядзелак, 14-га студзеня, старшыня СНК СССР тав. А. І. Рыкаў прыняў нямецкага пасла пана Гербэрта Дырксэна. Учора, 16-га студзеня, старшыня СНК СССР тав. А. І. Рыкаў прыняў аўганскага пасла пана Гулям-Набі-хана.

Падвышэньне кваліфікацыі кіраўнікоў прадпрыёмстваў.

МАСКВА, 11-I. Прэзыдыум ВСНГ СССР адчыняе ў Маскве курсы падвышэньня кваліфікацыі чырвоных дырэктараў заводаў хімічнае прамысловасьці (на 50 чалавек), і прадпрыёмстваў шкло-фарфоровае прамысловасьці (на 45 чалавек). Тэрмін навучаньня на курсах—10 месяцаў.

19 буйных збожжавых калгасаў.

САРАТАЎ, 13-1. Увосну ў краі засноўваецца 19 буйных збожжавых калектыўных гаспадарак, злучаньне суседніх в імі простых сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў і ўцягваньне туды незарганізаванага жыхарства. Калектыўныя гаспадаркі будуць згрупаваны там, дзе маюцца трактарныя калёны прыкладных райёнаў.

АХОВА ЗДАРОЎЯ ЯКУТАЎ.

ЯКУЦК. На мэдыцынскае будаўніцтва Якутыі сёлета выдзелена 200 тысяч рублёў. У Якуцку пабудован сухотны дыспансэр.

Прадаўся японскім імпэрыялістам

КАНГРЭС МАНГОЛЬСКІХ ПРАФСАЮЗАЎ І ПРАФІНТЭРН ВЫКЛЮЧЫЛІ МЭРСЭ З СВАІХ ШЭРАГАЎ.

МАСКВА. Кангрэс мангольскіх прафсаюзаў, які адбыўся ў кастрычніку 1928 г. ва Улан-Баторы, устанавіў, што пасьля паўстаньня ў Барго ў 1928 г. прадстаўнік мангольскіх прафсаюзаў, сябра цэнтральнага савету Прафінтэрну Мэрсэ пасхаў у Мукдэн і стаў там агентам японскага імпэрыялізму і кітайскае рэакцыі; атрымаўшы в японскіх крыніц грошы, Мэрсэ вярнуўся ва Ўнутраную Манголію і спрабаваў пачаціць прафсаюзы і народную рэвалюцыйную партыю Манголіі інтарэсам контр-рэвалюцыі. Кангрэс выключыў Мэрсэ з шэрагаў мангольскага прафруху.

Выканаўчае бюро Прафінтэрну цалкам згаджаецца з пастановаю кангрэсу мангольскіх прафсаюзаў, выключае Мэрсэ з шэрагаў Прафінтэрну і ўводзіць у склад цэнтральнага савету Прафінтэрну старшыню выканаўчага бюро цэнтральнага савету мангольскіх прафсаюзаў т. Чы-Джыта.

Ф

Выбіраем саветы.

Саветы будуць больш працаздольнымі.

Старшыня Менскага акрвыканкому тав. Яцкевіч, які выяжджаў на перавыбары ў Капыльскі і Узьдзенскі раёны, у гутарцы з нашым карэспандэнтам азначыў, што перавыбарчая кампанія ў гэтых раёнах у поўным разгары. Перавыбары саветаў праходзяць пры непараўнальна большай актыўнасьці, чым у мінулую кампанію. Абвастрэньне клясавай барацьбы яскрава адбіваецца асабліва ў Капыльскім раёне, дзе кулакі раўналежна з беднатой праводзілі свае сходы.

На перавыбарчых сходах пры абгаварэньні наказу кулакі выступалі супроць калектывізацыі, каапіраваньня і самаабкладаньня. У Дахтаровіцкім сельсавеце кулакамі быў нават сарваны перавыбарчы сход. У Ланцуцкім сельсавеце ноччу пасьля перавыбараў кулакі, помсьцячыся за правал сваіх кандыдатаў, разграмілі хату-чытальню. У шэрагу выпадкаў на перавыбарчых сходах кулакі, калі самі не маглі выступаць, выстаўлялі сваіх дырыжораў. У в. Быстрыцы быў выпадак, што кулакі зьявіліся на сход беднаты і выстаўлялі свае кандыдатуры. У Ланцуцкім сельсавеце хуліганы-кулакі ў часе перавыбараў пабілі вокны ў настаўніка-селькора за тое, што ён працягнуў іх хуліганскія ўчынкі ў насьценгазэце.

Не зважаючы на актыўнасьць кулакоў і падкулачнікаў, яны сустракалі над сабой адпор з боку беднаты і серадняцтва. Як правіла, у саветы абіраліся кандыдаты бядняцка-серадняцкага блёку. Вясковая інтэлігенцыя, асабліва настаўніцтва, прымае актыўны ўдзел у перавыбарчай кампаніі. У некаторых мясцох Капыльскага раёну недастаткова актыўнасьць камсамольскіх ячэек.

Актыўнасьць жанчын, у параўнаньні з мінулай кампаніяй, значна ўзрасла, але ўсё-ж у некаторых мясцох удзел жанчын у перавыбарах саветаў назначны.

Рабочыя брыгады ў часе перавыбарчай кампаніі былі ў абодвых памянёных раёнах і прымалі актыўны ўдзел у перавыбарах. Рабочыя праводзілі сходы, актыўна выступалі ў абарону бядняцка-серадняцкіх кандыдатаў, а таксама выступалі з тлумачэньнем агульных задач у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба сказаць, што беднякі і сераднякі адносіліся да прыезду рабочых брыгад вельмі прыхільна. Сяляне, зразумела, не кулакі, гаварылі, што змычка рабочых і сялян праводзіцца не на словах, а на справе. Калі параўнаць Капыльскі і Узьдзенскі раёны, дык лепш і арганізаваней перавыбарчая кампанія праходзіць у Узьдзенскім раёне, дзе і процант наведваньня перавыбарчых сходаў і процант удзелу жанчын больш, чым у Капыльскім раёне.

У заключэньне трэба сказаць, што сельсаветы ў значнай частцы аднаўляюцца. У Каменскім сельсавеце старшынёй сельсавету абрана жанчына-бяднячка Шчарбовіч Вера, якая на сваім выбарчым вучастку прайшла аднагалосна. Есьць усе падставы меркаваць, што ў сучасную перавыбарчую кампанію будуць абраны саветы больш аўтарытэтныя, бо процант яўкі на сходы значна большы, чым у папярэднюю кампанію. Воллуг вестак на сёньняшні дзень, сярэдні процант яўкі на праведзеных перавыбарах у Менышчыне складае 60 проц., а ў некаторых мясцох даходзіць нават да 72-87. Мы думаем, што саветы будуць больш працаздольнымі і ў сваёй штодзённай працы забясьпечаць інтарэсы бядняцка-серадняцкіх груп насельніцтва.

Бедната з серадняком---супроць кулака.

(Ліст з Бабруйску).

Далейшыя перавыбары сельскіх саветаў гавораць аб непаслабляючайся клясавай барацьбе, аб нябывалай актыўнасьці бядняцка-серадняцкага сялянства, аб перамозе бедняка і серадняка над кулаком у справе перавыбараў саветаў.

І кулак, бачачы сваю слабасьць, кідаецца на самыя апошнія вылазкі, каб разьбіць моц бядняцка-серадняцкага саюзу.

У вёсцы Пружанічах, Парыцкага раёну кулакі і падкулачнікі выступілі з адкрытым тварам супроць палітыкі партыі і ўлады.

Але пружаніцкую беднату і серадняцтва не правядзеш. Тут-жа на сходзе бедната і серадняцтва адобрылі палітыку партыі і ўлады на словах у рэзалюцыі і на справе, даўшы належны адпор усім гэтым контр-рэвалюцыйным кулацкім гутаркам.

Мала гэтага, вясковая бедната выкрыла тут, што мясцовае кулацтва ўтварыла забойства грамадзкага працаўніка і патрабавала для вінаватых самага суровага ўказу.

Кулацкая карта аказалася бітай. Гэта—агульнае зьявішча селетніх перавыбараў. Возьмем воволіцу Заменьрыньню, таго-ж Парыцкага раёну. Ужо нашто, здаецца, «добра» была пастаўлена «арганізацыйная праца» ў кулацтва па падрыхтоўцы да перавыбараў. Па хатах хадзілі, праводзіўшы „індывідуальную апрацоўку" беднякоў і сераднякоў у свой бок, а вынікі атрымаліся не на карысьць багацеяў. У савет абраны партыец, камсамолец і 3 жанчыны-бяднячкі.

Характэрным зьяўляецца факт, што ў некаторых мясцох дзень перавыбараў сельсаветаў зьяўляецца як-бы сьвятам. Такое зьявішча можна было наглядаць у Старобіне, дзе ў дзень перавыбараў мястэчка было ўпрыгожана чырвонымі сьцягамі.

Яўка на перавыбарчыя сходы абіральнікаў здавальняючая. У шэрагу весак Гаўскага раёну гэтая яўка дасягае 75 проц., у Продзьвінскім сельсавеце яўка хістаецца між 60-80 пр. У астатніх вучастках, дзе сельсаветы ўжо перавабраны, яўка прыблізна такая-ж. Амаль усюды, за рэдкім выключэньнем, у савет праходзяць кандыдатуры, выстаўленыя партыйцамі і бедватой.

А. Дамброўскі.

ПРА „ЧАВУСКІ" СПОСАБ ПЕРАВЫБАРАЎ.

(*Ліст з Магілеву*).

Таварышы з чавускае раённае перавыбарчае камісіі парашылі, каб іх імя было занесена ў гісторыю бягучых перавыбараў саветаў.

Па праўдзе кажучы, гэтая думка ўвайшла ім у галаву некалькі запозна. Бо ўся падрыхтоўчая праца да перавыбараў вялася досыць млява. Бедната «чакала», пакуль займуцца яе арганізацыяй (былі выпадкі, напрыклад, у вёсцы Вайнілах, калі бядняцкі сход разыйшоўся, не дачакаўшыся прадстаўніка з раёну); зразумела, што жанчынамі і моладзьдзю неяк «няручна» займацца, калі не абслужана бедната.

Так вось і пягнулася справа да моманту, калі падышоў час перавыбарчых сходаў.

— Ня важна,—парашылі ў Чавусах,—адны дамагаюцца перамогі «тихой сапой», іншыя-ж — кавалерыйскім наскокам. Урэшце-ж, „победителя не судят".

І вось аддаецца загад:

— Мабілізаваць раённы актыў. Паслаць яго ў Халмоўскі і Самулкаўскі сельсаветы, дзе перавыбары правесьці ў адзін дзень па ўсіх выбарчых вучастках.

Выехалі. Але прыехалі, як кажуць, у „пустое" месца. Прыйшлося ў адзін дзень прарабіць тую працу, якую належыла рабіць у працягу... ну, скажам месяца.

Сёньня—сходы беднаты, на якіх трэба намеціць кандыдатаў у склад сельсавету, ды, акрамя таго (такі быў загад з раёну), і наконт самаабкладаньня пагутарыць, бо на агульным сходзе і самаабкладаньне прымаецца.

Якія-ж вынікі „кавалерыйскага наскоку"?

У Чавусах здаволены:

— Вопыт удаўся. Вучэцеся іншыя раёны! Яўка—47 процантаў. Жанчын зьявілася 29 процантаў ад агульнай лічбы жанчын - абіральніц. Бядняцкія кандыдаты прайшлі цалкам у адным сельсавеце, а ў другім—па 6 вучастках цалкам і па астатніх двух—часткова.

Але можна чуць і іншыя галасы з месц, дзе чавускія працаўнікі прарабілі свой «экспэрымэнт». Адтуль скардзяцца на «скоропостижность» выбараў; кажуць, што «ударны» мэтад іх не здавольвае, што ім падабаецца больш «спакойная», але і больш сталая і працяжная праца; што у апошнім выпадку абіральнікаў зьявілася-б на сход яшчэ больш; і што, нарэшце, яя ўсюды прынята (язкую ня нязарганізаванасьці беднаты) самаабкладаньне, у той час, як папы дзе лі пасьпяхова праводзяць свае „самаабкладаньне"...

Ня ведаем, ці дазволяць чавускім таварышам працягваць іх «бліскучы» вопыт, а што наконт «Вучэцеся, іншыя раёны», дык гэтую параду трэба чытаць так:

— Вучэцеся з Чавус, як ня трэба працаваць.

КВІК.

Старшынёй сельсавету абралі бяднячку.

Бытчанскі сельсавет аб'яднае чатыры вёскі і адзін сельска-гаспадарчы тэхнікум. Гэтымі днямі адбыўся сход сялян, на якім абіралі новы сельсавет.

Яшчэ зпазаранку сяляне рыхтаваліся да выбару лепшых вясковых працаўнікоў у сельсавет. Увечары памяшканьне было набіта як дзьверы зачыніць, бедната толькі і гаманіла «ніводнага кулака і заможніка ня пусьцім у сельсавет".

На сходзе прысутнічала 85 проц. мужчын і 60 проц. жанчын. Сход зацягнуўся да позьняй ночы, кожная кандыдатура ў новы сельсавет падрабязна абгаварвалася.

У сельсавет абрана ўсяго 19 сяброў і 5 кандыдатаў, з іх мужчын 13 сяброў і 3 кандыдаты, жанчын 6 сяброў і 2 кандыдаты. Усе беларусы, беднякі, якія плацяць сельска-гаспадарчы падатак ад 60 к. да 40 р.

Старшынёй сельсавету абрана бяднячка т. Яранкевіч, *якая зьяўляецца першай жанчынай старшынёй с.-с. у раёне.*

На гэтым-жа сходзе арганізавана група беднаты і тры камісіі: падатковая, гаспадарча і культурна-санітарная. Абрана 6 чал. на раённы зьезд сельсавету.

Наогул перавыбары Бытчанскага с.-с. прайшлі пасьпяхова, трэба адзначыць, што ў гэтым сельсавеце да гэтага часу бедната ня прымала такога ўдзелу як у гэтым годзе. Іншым с.-с. трэба браць прыклад з Бытчанскага сельсавету.

Ал. С.—ч.

(Вёска Бытча, Барысаўшчына).

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ВЫБРЫК КЛЯСАВАГА ВОРАГА.

Гомель 17-1. У вёсцы Макоўе, Церахоўскага раёну выяўлена вылазка клясавага ворага. У сельскую школу была накіравана на пасаду школьнай прапаўніцы Гуревіч Р. Загадчык школы Драгунова Мар'я пачала ствараць склокі і на сходзе бацькоў выступіла з заявай, што Гуревіч Р. ня можа навучаць дзяцей. Абгрунтавала яе ў розных крадяжках у школе. Выездам на месца пракуратурай устаноўлена, што Драгунова Мар'я дачка ганцляра, пасьля прыезду нова назначанай настаўніцы Гуревіч, пачала яе праследаваць як яўрэйку. Драгунова распаўсюджвала чуткі, што вучні пакінулі наведваць школу, таму што настаўніца яўрэйка.

У сапраўднасьці ненаведаньне школы выклікана тым, што Драгунова Мар'я сыстэматычна зьбівала вучняў за ня веданьне вурокаў. Так быў зьбіты вучань Нікіцёнак Міхась, які пасьля побіту хварэў на вуха і нашоў займацца да настаўніцы Гуревіч. Былі зьбіты вучні Карзеў Алесь, Краснолёў і інш.

Бацькі вучняў, даведаўшыся аб правільнасьці чуткаў распаўсюджваемых Драгуновай, пазепшылі свае адносіны да Гуревіч. Яны пераканаліся, што Гуревіч лепш вучыць дзяцей, чым Драгунова. Апошняя зьнята з працы і прыцягваецца да крымінальнай адказнасьці.

Падрыхтоўка да ленінскіх дзён.

ГОМЕЛЬ, 17-1. На прадпрыёмствах пачалася падрыхтоўка правядзеньня пяцёхгодзьдзя з дня сьмерці Ул. І. Леніна.

У цэхах праводзяцца гутаркі, наладжваюцца спэцыяльныя вечары, выпушчаюцца насьценныя газэты.

На сходах рабочых некаторыя таварышы будуць выступаць з успамінамі. У клюбах будуць наладжаны выстаўкі літаратуры Леніна.

Аднагалосна правялі самаабкладаньне.

(Сакаловіцкі сельсавет, Крупскага р., Аршанскай акр).

Разам з перавыбарамі сельсавету, праводзіліся таксама сходы аб правядзеньні самаабкладаньня.

Прымаючы пад увагу добрае скарыстаньне ў мінулым 1928 годзе 35 проц. самаабкладаньня, як-та: пабудова 3-х мастоў, рамонт 4-х мастоў, набыцьцё пажарнай машыны, рамонт клюбу і г. д., пяпер аднагалосна прымаюцца пастановы абавязкова правесьці самаабкладаньне і скарыстаць самыя балючыя патрэбы вёскі, як-та: пабудову астаўшыхся ад мінулага году 2-х мастоў, абсталяваньне пажарнай дружыны, адчыненьне двохкамплектнай школы, адчыненьне ясьлаў, і лікпунктаў і інш.

На ўсім сельсавеце маркуецца сабраць 1898 р. 80 к.

Гармазінскі Я.

Завочныя курсы—для калгасьнікаў.

При Смялянскай с-г. прафшколе у мэтах дапамогі ўзмацненьню калектыўных гаспадарак Коханаўшчыны (Аршанскай акругі), арганізуюцца завочныя курсы па рахункаводству і арганізацыі гаспадаркі.

Курсы разьлічаны на 34 асобы (па 2 асобы ад кожнае калектыўнае гаспадаркі). Для жанчын калектыўных гаспадарак завочныя курсы арганізуюць вывучэньне птушніцтва і домаводзтва, а для беднейшага сялянства—маліарацыйную справу.

Уся праца кіруючага і інструктарскага складу завочных курсаў праводзіцца ў парадку грамадзкай працы.

Да агляду чырвонай казармы.

Гомель, 17-1. Працоўныя Гомельшчыны разгортваюць працу па ўдзелу ў правядзеньні агляду чырвонай казармы.

Учора ў друкарні Палесдруку адбыўся далегацкі сход, на якім абгаварваўся парадак удзелу рабочых у гэтай кампаніі.

На асобных прадпрыёмствах рабочыя камандыруюць сваіх прадстаўнікоў для агляду казармы і для распрацоўкі парадку актыўнага ўдзелу ў гэтым аглядзе.

Сяляне хадайнічаюць аб зачыненьні царквы.

ВОРША, 17. Сяляне в. Бухатава, Дубровенскага раёну ўзбудзілі перад Райвыканкомам хадайнічаньне аб зачыненьні Мардашэвіцкай царквы і аб адчыненьні ў ёй клюбу, бо купленае для вёскі шэфам-рабочымі фабрыкі „Дняпроўская мануфактура" радыё няма дзе паставіць.

Да голасу сялян вёскі Бухатава далучыліся сяляне вакольных вёсак Нарады і Бабічы.

Пастанова аб зьбіраньні попелу.

ВОРША, 17-1. Прэзыдыум Акрвыканкому пастанавіў, каб усе установы, заводы і фабрыкі зараз-жа прыступілі да зьбіраньня попелу ў сваіх прадпрыёмствах.

Савгасы і калгасы павінны зьбіраць попел і ўжываць у сваіх гаспадарках. Адказнасьць за справу зьбіраньня попелу ускладзена на загадчыкаў установаў.

Аршанскаму гарсавету прапанавана справу зьбіраньня попелу праводзіць праз жылкаапэрацыю.

Фанэрны завод пачаў працаваць.

Гомель, 17-1. Рамонт фанэрнага заводу пасьля катастрофы закончан. Завод пачаў працаваць поўным ходам.

Заводакіраўніцтва і фабком фабрыкі „Везувій" узьнялі пытаньне перад адпаведнымі органамі аб выдачы прэміі майстрам заводу «Пролетарый», якія ня лічыліся ні з якімі цяжкасьцямі і зрабілі пліты ў такі тэрмін, у які ні адзін завод не хацеў брацца.

Сяляне вучацца.

При Смялянскім с-г. Сялянскім Тэхнікуме (Аршаншчына) вядзецца падрыхтоўчая праца па набору другой групы слухачоў—сялян узростам ад 30-45 год.

Першая група пачала сталыя заняткі з 18 лістапада 1928 г. Заняткі ідуць нармальна. Лік наведваючых слухачоў 60, у гэтым ліку каля 20 пр. жанчын.

Забойства актывіста.

(*Па тэлеграфу ад нашага карэспандэнта*).

МАГІЛЕЎ, 17-1. У Васілеўцы, Хоцімскага раёну забіты актывіст Дземкін, калі ён вярочаўся пасьля перавыбараў, дзе выступаў супроць кулацкіх кандыдатаў. Па гэтай справе арыштавана пяць чалавек у тым ліку і забойца.

Арганізуецца збор паперы.

Гомель, 17-1. Ва ўсіх установах і прадпрыёмствах арганізуецца збор ягоднай паперы Для збору паперы ставяцца спэцыяльныя скрыні.

Апроч таго, у асобных установах ужо распачат перагляд архіваў. Архіў фінадзелу важыць каля 2.000 пуд., у акрпрафсавеце да 2.000 пудоў і г.д.

Значная частка гэтых архіваў можа быць скарыстана як макулатура. У зборы паперы будуць удзельнічаць піянерскія арганізацыі.

ШЫРЭЙ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

У Менскай акрузе падрыхтоўка да сяўбы праходзіць слаба.

Праведзенае абсьледаваньне стану зерначышчэньня ў Самахвалавіцкім і Койданаўскім раёнах, Менскай акрузі сьведчыць аб поўнай незацікаўленасьці гэтай справай на мясцох.

У Самахвалавіцкім РВК пытаньне зерначышчэньня ўпяршыню абмяркоўвалася толькі 12-га сьнежня 1928 году. 6-га студзеня гэта пытаньне абмяркоўвалася на с.-г. савеце, у той час, як гэта трэба было разглядзець 20 га лістапада. Мала такога праступнага спазьненьня, дык плян падрыхтоўкі да сяўбы яшчэ да гэтага часу неаформлены.

З 13-ці зерначышчальных пунктаў да гэтага часу зерначышчэньне пачалі фактычна толькі на 1-м пункце. На словах агранома, працуюць і інш. пункты, але пры праверцы на двух пунктах аказалася, што ў савгасе Прылуках нават не малацілі яшчэ, а ў савгасе Калініна за 52 дні ачышчана ўсяго 1079 пуд. (500 пуд. агранамічнага пункту і толькі 579 п. сялянскага вбожжа).

Ня лепш стаіць справа па зерначышчэньню і ў Койданаўскім раёне. Тут таксама зерначышчэньне толькі распачалося. На пункце Ружанполь да 14-га студзеня ачышчана 42 п. сялянскага насеньня, у Вільшчане—18 пуд.

Кіраўнікі савгасаў ня вельмі сьпяшаюцца з зерначышчэньнем.

Некаторыя сельсаветы яшчэ да апошняга часу ня выпрацавалі поўнага пляну правядзеньня зерначышчэньня і ня вельмі заахвочваюцца распачынаць гэту кампанію зараз. У Макаўчыцкім с. с. трыер спакойна стаіць у пуні, завалены сенам і саломай.

Наогул, на пунктах Койданаўскага раёну нядбайна адносяцца да с.-г. машын. На панадворку Ко данаўскага машыннага т-ва ляжыць пад сьнегам новая дыскавая сеялка.

На калегіі Наркамзему быў заслуханы даклад Менскага Акрва аб стане зерначышчэньня ў акрузе. Выявілася, што Акрва ня прыняў належных мер, каб належна паставіць справу зерначышчэньня; не правяралася да апошняга часу, як праводзіцца зерначышчэньне на мясцох і г. д.

Калегія пастанавіла прасіць СНК БССР зьняць з пасады намесьніка загадчыка Менакрва тав. Козеля за слабое распарадчасьць а таксама прыцягнуць да адказнасьці сем раённых выканаўчых камітэтаў, якія да гэтага часу не далі справаздач аб ходзе зерначышчэньня.

Сваечасова разгарнулі кампанію.

(Ліст з Гомелю).

У акрузе распачата падрыхтоўка да правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі. Гэтай кампаніі будзе зьвернута максымум увагі. Мабілізуецца ўвага сялянства да пытаньня ўзьняцьця ўраджайнасьці. Намячаецца ў акрузе ўзьняць ураджайнасьць на 4 процанты. Засеўная площа будзе павялічана на 5 процантаў. Па асобных культурах рост засеўнае плошчы намячаецца: пад лёнам—21 проц, бульбаю—8,4, канаплёй 24, канюшынай—21, вікай -14. лубінам — 300, сарадэляй—200, кораньплодамі - 400. Плошча пад зернавымі культурамі, галоўным чынам, грачыхай і просам будзе скарочана на 3,6 процанту.

Для ўзьняцьця ўраджайнасьці намечаны розныя мерапрыёмствы. Асаблівая ўвага зварочваецца зерначышчальнай кампаніі. Ужыты захады да вычысткі за 900 тысяч пудоў засеўнага насеньня, што складае 90 проц. агульнае колькасьці засеўнага матар'ялу. Будуць пратручаны да 50 тысяч пуд. яравых культур. Па зерначыстцы будуць працаваць у сярэдніх да 180 машын. У буйных раёнах будуць працаваць ад 4 да 8 абозаў, у дробных - па 2 абозы. Для з'бясьпечаньня насельніцтва ўгнаеньнямі намячаецца завезьці 1340 тон мінэральных угнаеньняў. Ужываюцца захады да выкрыстаньня драўнянага попелу. Акрвыканком ужо запрапанаваў усім прадпрыёмствам устанавіць скрыні і арганізаваць збор попелу. Адказнасьць ускладзена на кіраўнікоў прадпрыёмстваў і ўстаноў. Будуць выкарыстаны да 100 тысяч пуд. торфу, глей з вазераў і сажалак і шэраг іншых адкідаў для ўгнаеньня па ўзьняцьці ўраджайнасьці.

У адносінах кантрактацыі засеваў намечаецца закантрактаваць засевы бульбы 3500 гектараў, ячменю—500, лену і валакна—1500, ільнянага насеньня—1000, канопляў—350, канюшыны—400, лубіну—1000, кораньплодаў—15 гектараў. Намячаецца арганізаваць у акрузе 285 ячэек вытворчых аб'яднаньняў. З іх 49 калгасаў будуць арганізаваны на плошчы да 1000 гектараў.

Для рамонту сельска - гаспадарчых машын намячаецца арганізаваць 12 рамонтных майстэрняў у калгасах, савгасах і кредытных таварыствах. Намячаецца ў першыя вясеньняе засеўнае кампаніі рэалізаваць сельска-гаспадарчых машын на 400 тысяч руб. Для беднаты і калгасаў машыны будуць выдавацца на ільготных умовах.

Па садоўніцтву маркуецца насадзіць сады на плошчы 25 гектараў, у парніках высадзіць да 270 тысяч плодовых дрэў і пабудаваць 150 парнікоў у калгасах акругі. Арганізуюцца 5 атрадаў для барацьбы са шкоднікамі засеву.

У зімовы перыяд будуць арганізаваны 15 доўгатэрміновых і 34 кароткатэрміновых курсаў і будуць прачытаны 2200 дармовых лекцый з прапускам да 80 тысяч сялян. Будуць арганізаваны да 100 сельска-гаспадарчых гурткоў.

Наогул, пры ўзмацненьні мабілізацыі ўвагі да пляну і прыцягненьня да актыўнага яго абмеркаваньня на шырокіх сялянскіх сходах мерапрыёмствы па ўзьняцьці ўраджайнасьці будуць выкананы, што дасьць адпаведныя вынікі.

Зс.

Ачыстка насеньня не пачалася.

(*М. Пясочна, Капыльскі р. Менск. акр.*).

Плян Пясоцкага сельска-гаспадарчага кредытнага таварыства па падрыхтоўцы да вясновай сяўбы абымае тэрыторыю пяці сельсаветаў: Бабаўнянскага, Пясоцкага, Камяноцкага, Вялетынскага і часткова Магільнянскага.

Плянам т-ва прадугледжана загатаваць на месцы наступны лік высыўнога матар'ялу: аўса—1 тону, ячменю—2 тоны, вікі—2 тоны, сарадэлі—3 тоны, лубіну—5 тон (лубін будзе загатаваны ад кантрактацыі).

Падрыхтоўчая праца па загатоўках на мясцох ужо распачалася. На сягоньнешні дзень, з пакаванага ліку загатавана: аўса—5 цэнтнэраў, ячменю—2 тоны 8 цэнтнэраў і тры цэнтнэры 12 кілеграм сэрадэлі.

Але дакуючы таму, што наш раён ня збожавы, патрэбен завоз наступнага насеньня: аўса—49 тон, ячменю—3 тоны, лёну-даўгунцу—5 тон, канюшыны-чырв.—1/4 тоны, цімафеўкі—40 кілёграм.

Акрамя тых зерначышчальных машын, што маюцца (трыер, вятранка, ільна-трашчотка і інш.) на 1929 г. маркуецца завезьці наступны лік машын: сартыровак—2 штукі, трыераў—3 шт. (ужо прывезены), што каштуе 437 рублёў.

З апрацовачных прыладаў будзе завезена: барон—„вігвагг"—18 штук, спружынковак—40 шт., асыпнікаў—10 шт., сеялак радавых—2 штукі.

Штучных угнаеньняў запатрабавана тамасшлаку—5 тон, калійнай солі—2 тоны. Іншых угнаеньняў не запатрабавалі, бо райгранром забараніў: глеба ня спрыяе.

Троху горш абстаіць справа з аграпрапагандай і пачаткам працы па збожжаачышчэньню. Хаця яшчэ праца з аграпрапагандаю, як той кажа, і не спазьнілася, але ўсё-ж трэба адзначыць, што па пляну пасеўкампаніі даўно ўжо трэба было правесьці сход з упаўнаважанымі, пасьля чаго апошнія паправодзілі-б сходы на мясцох, але па якойсьці прычыне ня прыехаў райгранром і такая важная справа знайшла так званы „пачакай".

Ня менш дрэнна абстаіць справа і з зерначышчэньнем. Першы пункт пляну, (складзенага райагранамійі) гаворыць:

«Распачаць зерначышчальную кампанію з сьнежаня месяца, а ня ў студзені і лютым як у мінулыя гады». А калі-ж гэты плян атрымалі на мясцох? Напрыклад, Пясоцкі сельсавет атрымаў 20 сьнежня 1928 г. (гэта тады, калі па пляну трэба, каб ужо машыны працавалі). Якая гэта пастаноўка—пытаньне? Я сказаў-бы, што гэта фармальна бюракратычная пастаноўка!

Сельсавет таксама адгаварваецца тым, „што паперкі ўжо разасланы ўсім членам сельсавету". Але, як бачыце паперкі засталіся паперкамі, а тое, што засьмечанасьць высяваемага матар'ялу ў нашым раёне дасягае рэкордных разьмераў (13-15 пр.) дык гэта нашым мясцовым арганізацыям—хоць-бы хны!..

Адсюль вывад, каб не дапусьціць на сяўбу засьмечанага насеньня, трэба скарыстаць вопыт мінулых гадоў, выкарыстаць склаўшыяся ўмовы і зараз, пакуль ня позна, узяцца за працу.

М. Варанецкі.

ЗБОР ПОПЕЛУ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ ПАСЯЎНОЙ КАМПАНІІ.

Гомель, 17-1. У Гомелі да вясны намячаецца сабраць да 30 тысяч пудоў попелу. Увесь сабраны попел будзе разьмяркаваны паміж калгасамі, савгасамі, мэліарацыйнымі таварыствамі і пасёлкамі. Калгасы і савгасы прымацаваны да асобных прадпрыёмстваў. Усяго да Гомельшчыны прымацавана 7 калгасаў, 6 савгасаў і 5 мэліарацыйных таварыстваў.

Трэба адзначыць, што асобныя прадпрыёмствы рознымі мэтадамі імкнуцца ня зьбіраць попелу. Асабліва ўхіляецца ад арганізацыі збору попелу завод „Дзигатель Революции".

КУЛЬТЫВІЗАЦЫЯ ПАСЕВАЎ ЦЫКОРЫЯ.

Гомель, 17-1. Акрземаддзел распачаў культывізацыю пасеваў цыкорыя ў Брагінскім, Хойніскім і Ўваразіцкім раёнах. Усе пасевы будуць закантрактаваны Цэнтрасаюзам.

Кожнаму кантрактанту будзе выдадзена насеньне на пасевы і задатковая сума ў разьмеры 150 р. з дзесяціны. Валавы прыбытак з дзесяціны цыкорыя па вестках спэцыялістаў Цэнтрасаюзу дасягае каля 600-800 р.

Для правядзеньня гэтай працы ў нашай акрузе цэнтрасаюз камандыраваў спэцыяльнага працаўніка.

НА ВАРЦЕ ЗДАРОВАГА САВЕТУ.

„Таемныя асобы". „Чарка самагону". „Кукіш клясавага ворага". Ясьлі. У жанчын разьвязаны рукі. Бядняк пераможца.

Марозна, вечар атуліў вёску. У заьнежаных і прыціснутых да зямлі хатках заблішчалі кволым сьветам вочкі—вакенцы.

Ціха. На вуліцы ні душы. Але вось начную цішыню рэзка парушыў скрып людзкіх шагоў. Каля аднае хаты шагі змоўклі і ў слабым водблеску ад дробнага вакенца можна было ўгледзець дзьве шэрыя фігуры, закутаныя в галавою ў доўгія кажухі. Таемныя людзі настаялі, ціха аб чымсь пагаварылі і накіраваліся ў хату. Праз хвілін дзесяць невядомыя людзі вышлі з хаты, і зноў заскрыпелі іх цяжкія крокі па ціхай вясковай вуліцы. Каля маленькай халупкі, якая цалком са страхой ўкрасла ў сьнег і чуць блішчыць па вуліцу адным вакенцам, таемныя людзі спынініся зноў, памаўчалі і адзін з невядомых накіраваўся далей.

— А да Базыля хіба ня войдзем?—спытаўся другі невядомы.

— Не.

Невядомыя людзі пашлі далей. Так яны абышлі ўсю вёску. Каля адных зьявярэй гэтыя таемныя людзі доўга тапталіся, аб чымсь пашэпталі і ў першую заходзілі ў хату, ці ішлі далей. У другія хаты яны, наадварот, заходзілі сьмела і хутка іх пакідалі.

Што гэта за таемныя людзі і зачым яны парушаюць спакой марознага вясковага вечара?

Гэта—заможнікі ў вёсцы Слаўнае (Чарнякоўскага сельсавету) рыхтуюцца да перавыбараў саветаў.

Тут яны на чале з уласьнікам ялына арганізавалі абход па дварох, узмоцнена папулярызуюць сваіх кандыдатаў у новы савет і агітуюць супроць кандыдатаў беднаты. Такую працу па Прапойскаму раёну вядуць заможнікі у Чарнякоўскім, Каменскім, Ржаўскім і іншых саветах. У гэтых сельсаветах, як больш заможных у раёне, з вялікім процантам хутароў заможнікі выступаюць вельмі актыўна. Апрача абходу па дварох, які практыкуецца на многіх вучастках гэтых сельсаветаў, заможнікі тут ужываюць і іншыя „мэтады": спайваньне і запужваньне.

— Заходзь да мяне, Сымон,—запрашае бедняка хітры заможнік, пагаворым.

Заходзе Сымон да суседа, а там ужо і іншыя беднякі. Чарка самагону, асьпярожныя намёкі на дабрату і розум Макара і Сымон гатоў. Калі ён выходзе ад суседа, дык у яго затуманенай самагонам галаве вобраз Макара вітае, як нешта найлепшае. Гэта заможніку і трэба. Ён пераканаць, што калі на перавыбарчым сходзе будзе высунута кандыдатура Макара, дык Сымон першы будзе галасаваць за яе.

Калі бядняк ня ідзе на спайваньне, заможнік спрабуе запалохаць яго.

— Выбірайце, выбірайце па сьпісах—шэпчуць кулакі па Каменскаму сельсавету,—яны вас гэтыя „сьпісы" потым так самаабкладуць, што не падымецеся. Ня толькі нам,і вам хопіць.

Так «агітуюць» заможнікі Прапойскага раёну за сваіх кандыдатаў. Але гэта кулацкая агітацыя, ня гледзячы на сваю актыўнасьць, ня мае шырокага поля для сваёй дзейнасьці—яна як у сьцяну ўпіраецца ў арганізаванасьць беднаты. Бядняк, выступаючы ў шчыльным саюзе з большасьцю сераднякоў, на ўсіх франтох дае адпор заможніку і пільна абаранае ад яго свае перадавыя пазіцыі—сельсаветы. Першыя вынікі перавыбараў па Прапойскаму раёну кажуць аб гэтай арганізаванасьці і актыўнасьці беднаты за першыя два дні (з 8-га па 10-е праведзены перавыбары па 5 вучастка). Наведваньне сходаў на гэтых вучастках складае 70-80 проц. На ўсіх вучастках прайшлі кандыдацкія сьпісы беднаты. Апошняя, ня гледзячы на стараньні заможнікаў, ня пусьціла іх у саветы. Яна дзейна абараняе савет ад заможніка.

У некаторых мясцох барацьба беднаты з заможнікам мае літаральна дзейны характар. Напрыклад, на Каменскім выбарчым вучастку пасьля выбараў было пастаўлена пытаньне аб самаабкладаньні. Адзін бядняк выступіў з прапановай прыняць самаабкладаньне на большую суму, чымся летась. Ня ўзлюбілі гэтага кулакі, а адзін з іх падняў крык:

— Што? Ты самаабкладаньня хочаш? А планіць хто будзе? Мы? Дык вось-жа табе самаабкладаньне,—і тыча бедняку кукіш пад нос.

— Не сьцярпеў гэтай абразы ад клясавага ворага бядняк, размахнуўся і... бац.

— Вось табе ў тваю кулацкую „фізіку". Не зьневажай.

Пад дружны хохат усіх прысутных кулак пакінуў сход, а пераможца-бядняк прадаўжаў далей і з агітаваў сход прыняць самаабкладаньне на 25 проц. ад падатку.

Актыўна прымаюць удзел у перавыбарах сёлета жанчыны. Для таго, каб даць жанчынам магчымасьць шырэй наведваць сходы, Прапойскі РВК арганізаваў сёлета на час перавыбараў звыш 30 адналвённых ясьлаў. Жанчыны вельмі здаволены гэтым.

— Цапер і ў нас рукі ня зьвязаны, пешацца жанкі і дружна ідуць на сходы.

У сярэднім наведвае сходы каля 60 проц. жанчын, а там дзе арганізаваны ясьлі, гэты процант даходзе да 80-90. На сходах жанчыны выступаюць больш уважліва, чымся мужчыны, наглядаюць, каб у савет не пралезьлі шкодныя людзі. Напрыклад, у Прапойскім местачковым савеце на перавыбарах у 2-м вучастку жанчыны ўжо пасьля выбараў далі адвод аднаму члену савету.

— Такіх нам не патрэбна. Выкінуць яго!

І сход пад націскам жанчын змушан быў перавыбіраць члена савету. А «такі» не падабаўся жанчынам тым, што выступіў супроць самаабкладаньня.

Так бароняць жанчыны свой савет ад людзей, якія ня толькі будуць лішнімі ў савеце, але і шкодзяць яго працы.

Гэта актыўнасьць жанчын, арганізаванасьць беднаты, якую выявілі першыя дні перавыбараў па глухому Прапойскаму раёну, забясьпечвае сельсаветам здаровы бядняцка-серадняцкі склад; яна, гэта актыўнасьць, сьведчыць і аб значным палітычным росьце магілеўскае вёскі. А. Савёнак.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ПРАВЕРКА—САМАКРЫТЫКА—КАНТРОЛЬ МАС.

УЗМАЦНІМ АГОНЬ ПРАЛЕТАРСКАЕ КРЫТЫКІ ПА ЎСІХ ШКОДНІКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Прогонім дрэнных гаспадарнікаў.

Хваткі, хвасты і хвасьціны.

(*Маленькі фэльетон*).

У чытача пра «хвасты» ўжо склалася думка прыблізна такая:

Калі ў фальетоне ны пра хвасты—значыць якісь „ня із чын" атрымаў новую пасаду, едзе на новае месца і камешне цягне за сабою «неаменных» работнічкаў, без якіх справы не наладзіць.

Пра такія хвасты шмат пісалася, ны усім памятны.

Але сёньня рэч пра другія хвасты. Пра хвасты іншага парадку. Не пра тыя хвасты, што валачэ за сабою савецкі пампадур, а менавіта пра тыя, якія ён за сабою пакідае.

Нас паведамілі, што некаторыя кіраўнікі савецкіх гаспадарак Белсельтрэсту на працягу 4-х гадоў сваёй працы ў савгасах вырасьцілі хваткі, хвасты і вялічэзныя хвасьціны. Гэтыя хваткі, хвасты і хвасьціны складаюць ня больш ня менш як 48971 р.

Каштоўнасьць хвастоў розная і вырашчваліся яны па розному, у некаторых кіраўнікоў хвасток пачынае расьці з 4 ці 10 рублёў і паступова вырастае да 5000 рублёў і больш. Добрая рэч, узяць 48971 руб. з абароту савгасаў і палажыць іх у прыватныя кішэні кіраўнікоў савгасаў. Здаецца—лепей было-б, каб гэтыя грошы знаходзіліся ў саміх савгасах, ці ляжалі-б у касе ашчаднасьці пад процантамі.

За чатыры гады пры васьмі процантах капітал-бы ўзрос да 64639 рублёў.

Гэта адна карысьць, а другая карысьць была-б, калі-б гэтыя грошы былі пушчаны на пабудову якога-небудзь прадпрыёмства і гэтым самым далі-б магчымасьць скараціць беспрадоўе.

Ды ці мала-б чаго можна было-б зрабіць на гэтыя грошы. Пра ўсё і ня скажаш.

А па справе 48971 руб. савецкіх грошай захавалася ў прыватныя кішэні, сядзяць там і плачуць па сваіх савгасах (сумняваемся, каб яны былі ў кішэнях савгаснікаў), з якіх іх выкралі некаторыя кіраўнікі пры пераходзе на працу ў другі савгас. Вось гэтыя пераходы з аднаго савгасу ў другі і далі магчымасьць вырасьціць хваткі, хвасты і вялізарныя хвасьціны.

Як бачыце, справа вусім з другімі хвастамі. 64 савгасаўскія прапаўнікі як пры пераезьдзе, так і на месцы розными спосабамі заставілі пры сабе 48971 рубель. На кожнага ў сярэднім на 765 рублёў і па 17 з паловай капеек.

Гэта толькі ў сярэднім, пры падліку на паперы, але ў рэчаіснасьці такой ураўніцельнасьці няма. Тут ёсьць скрыўджаныя, якія ўзялі па 4, па 5, па 10 р., ёсьць і такія, якія могуць быць задаволеныя, і прысвоілі 5 і 7 тысяч руб.

Мы ня можам устрымацца ад таго, каб не паказаць такія буйныя фігуры, што назаставілі хвасьціны.

На першым (ня ведаем наколькі качэснае месца) ідзе Летаўт з савгасу Дурынічы, за ім лічыцца 7732 р. і 94 капейкі. На мала адстае Ігнатовіч са Мсьціжу; за ім 5503 рублі 42 капейкі. Далей ідзе Кавалеўскі, які захапіў у касе Межава-Пажэцкага савгасу 4569 рублёў і 9 капеек і зусім спакойна працуе ў савгасе Лудчыцы. Не адстае і Барушка І. з савгасу Палелюм; прысвоіў 3878 рублёў і 90 капеек і жыве сабе і ў ус ня сьвішча.

Нельга ж канешне ня ўспомніць Баброва, які прыкішэніў 2005 руб. 90 к. Альбо Кавалеўскага С.С. прысвоіўшага 2002 р. 39 кап. Ці ж мінаць Федарэнчыка, 2051 р. 78 к.—таксама-ж грошы.

Хацеў ужо пералічэньні і скончыць, але ўзела-ж на вочы прозьвішча Кормейчыка—былога кіраўніка савгасу Сержпутова. Працуе ён, праўда, і цяпер у савгасе Валчковічы, але грошы ён узяў з касы Сержпутоўскага савгасу.

Памянёныя фігуры ўсе буйныя, як акуні ды шчупакі плаваюць. Яны хвасьціны даўжэзныя пазаставілі.

А колькі іх драбнейшых, што хвасты пазастаўлялі? Бярусь пералічваць...

Але выбачайце, бачу, што вам надаела. Ня буду ў такім разе пералічваць і дробнае плоткі, якая толькі хваткі пазастаўляла.

Былі хваткі, вырасьлі хвасты і хвасьціны, а Белсельтрэст нібы пра гэта і ня ведае, ніякіх мер, як нам вядома, ня прыймае.

Хутка гэтая грамадка з'явіцца ў Белсельтрэст, запросіць аб сьпісаньні грошай. Ня ведаем, што скажа ім Белсельтрэст, але спадзяёмся, што пракуратура і РСІ гэтыя хвасты паадрубае.

Васіль Золкі.

Гіне жалезнае ламаччо.

Гутарка ідзе аб нядзельніку збору жалезнага лому.

Як толькі распачалася гэтая кампанія, дык камсамольцы і камсамолкі, як мурашкі, заварушыліся і пачалі хадзіць з двара ў двор, каб пазьбіраць усё жалезнае ламаччо, якое да гэтага часу валялася па розных кутках.

Прыходзіць група камсамольцаў на Інтэрнацыянальную вул., д. № 31, дзе вымяшчаецца 18-я і 1-я 7-годкі і пытаюцца:

—Ці ёсьць тут якое-небудзь жалеза?

Ім адказалі, што жалеза тут есьць шмат, але толькі бяда будзе яго дастаць, бо яно ляжыць на гары (на чардаку) амаль да 200 пуд.

Да вечара яшчэ далёка, пасьпеем адвязьці яшчэ на склад,—адказалі камсамольцы.

Пашоў прадстаўнік гэтае групы да старшага стоража гэтае школы т. Высеўкі, каб ён дазволіў прыняцца за працу, бо без дазволу на гару не залезеш. Але ня так лёгка атрымаць дазвол, як гэта здаецца. Т. Высеўка кажа, „што гэтае жалеза належыць школе, яна яго зьбірала і ны самі прададзім яго на карысьць школы".

Пачуўшы такі адказ, камсамольцы завярнуліся і пашлі далей па сваёй справе.

Фактычна-ж, школа зьбіраньнем жалеза ніколі не займалася, а ў гэтым ломе жыў калісьці былы гандляр Міровіч, які выехаў з Менску, а гэтае жалеза заставіў на тым самым месцы, дзе яно і да гэтага часу ляжыць.

Прайшло амаль каля двух м-цаў часу, а жалеза, як ляжала, так і ляжыць, толькі, як мне здаецца, нешта пачало яно патроху ісьці на «ўсушкі».

Бачыце паважаныя чытачы, якія ёсьць людзі сквапныя на чужую спадчыну, як напрыклад, т. Высеўка.

Неабходна гэтай справай зацікавіцца належнай установе і растлумачыць т. Высеўку ў чыю карысьць ідзе збор гэтага лому і на чые сродкі існуе школа, а гэтаксама, каб ён ня быў такі сквапны на чужую спадчыну.

Дзед Пятрусь.

Менск.

Валакітчыкам і бюракратам—ня месца ў савецкіх установах.

У чым тут справа?

Паедзьце ў вёскі: Сутокі, Ляда і Антапольле Юраўскага сельсавету, Смалявіцкага раёну і вас пытаюць: чаму прапала наша праца, дзе канцы знайсьці?

Вас зацікавіць гэтае пытаньне. Вы ваш лісце, у чым тут справа, а выслухаўшы сялян, з жарам апавядаючых гісторыю з млынам, запішаце нешта сабе ў блёкнот, паабяцаеце спытаць, праверыць, зрабіць і сказаўшы, што праца сялян ня можа прапасьці, паедзеце...

Гэтак прыблизна было некалькі разоў. Заяжджалі ў гэтыя вёскі, па словах сялян многа людзей, слухалі, пыталі, запісвалі, абяцалі і... ехалі, а сяляне чакаюць і сёньня.

Гадоў пяць таму назад гр-ка Фейга Мушкіна заключыла з Белсельтрэстам умову на пабудову ў савгасе «Антапольле (зараз «Красная Звезда») млыну. Гэтая-ж грамадзянка дагаварылася з сялянамі вёсак Сутокі, Ляда і Антапольле аб тым, што яны будуць працаваць на пабудове млыну ў кредыт, а потым, як млын будзе ўжо працаваць, будзе выплачваць ім. Сяляне згадзіліся, як кажуць яны самі па прыказцы: «у млыне ды кузьні—нічога не прападзе, там адмелем, тут адкуем».

Гр-ка Мушкіна завяла вялізарную кніжку у якую запісвала працу сялян, а як млын пачаў працаваць,—аплачвала гэтую працу на пуду, два.

А ў 1925 годзе вясною з-за вялікага выкананьня гр-кай Мушкінай умовы, складзенай ёю з трэстам, умова была разбурана і млын быў перададзен савгасу.

Сяляне аграву-ж да загадчыка савгасу, як будзе? Той заверыў, што савгас будзе плаціць ім як і плаціла былая ўладарка млыну, каб толькі прадставілі квітанцыі. Але калі праз некалькі часу прышлі за платай, той-жа загадчык загаварыў зусім па-другому:

—Я вас не наймаў і плаціць вам ня буду, і ўсё.

Сяляне перадалі справу ў Смалявіцкі парсуд, а адтуль яна папала ў Менскі акруговы суд. У верасьні 1926 г. паклікалі сялян у Менск, апрасілі і сказалі што на разбор справы іх запросяць позвамі. У судзе акружным адзін з судзьдзяў казаў сялянам: «ваша не прападзе, будзьце пакойны, перадайце гэта грамадзянам».

Заспакоеныя паехалі дадому. Позваў ня было і таму ў канцы 1927 году паехалі зноў у Менск, хадакі ўжо, шукаць гэтую справу. Пры справе знаходзіцца тоўстая рашчотная кніга і таму яе хутка знайшлі ў шафе, зноў пагледзелі і ўжо сказалі, што справа будзе абавязкова разьбіраца.

На працягу ўсяго гэтага часу сялянам казалі і ў парсудзе і ў акруговым судзе ў 26 г. што тут ім павінен плаціць трэст, які карыстаецца млынам. Казаў гэта і адвакат, які браўся абавязкова выіграць гэтую справу за адну трэць усяго належачага сялянам збожжа.

Але яны былі заведта ўпэўнены ў сваёй праваце і адваката не ўзялі. А ў пачатку 1928 г., калі гэтая справа разьбіралася ў акруговым судзе, сяляне праігралі. суд пастанавіў узыскаць усё належачае сялянам з гр-кі Мушкінай. І ўсё змоўкла.

Мушкіна заплаціць не нагла, бо ня мае сродкаў, з яе, як віць, міліцыя ня мае чаго ўзяць і не бярэ.

Савгас, які карыстаецца млынам, застаўся ў баку ад гэтае справы. А сяляне сядзяць і не разумеюць мудрасьці такога судзейскага рашэньня. Бо і пастанова суду ёсьць, і адказчыка нібы ёсьць, а яны ніводнага фунта не атрымалі.

У чым-жа тут справа?

А ў тым, што суд падышоў да гэтае справы фармальна: наймала Мушкіна, вяхай і плоціць.

Неабходна, каб адпаведныя органы далі чоткі адказ сялянам на іхнае запытаньне. Адказу чакаюць вельмі многія: «чаму прапала іхняя праца, дзе канцы знайсьці?».

П. Галавач.

Беларускую мову едуць вывучаць у... Сымфэропаль.

Як і ўсе навучальныя ўстановы, Гомельскі Белпэдтэхнікум атрымлівае ад НК Асьветы ліцеры на бясплатны і льготны праезд у часе вакацый вучняў.

Ліцеры на бясплатны праезд па палажэньню павінны выдавацца ў выключных выпадках бяднейшым вучням, а льготныя выдаюцца ўсім вучням, якія едуць на вакацыйны адпачынак.

Адначасова ёсьць адна форма ліцераў, якія выдаецца на экскурсіі і навуковыя камандыроўкі. Гэтыя апошнія могуць быць скарыстаны ў 5 кавпоў. Досыць выгадныя ўмовы, і ранейшы дырэктар тэхнікуму Касьценіч, зараз акружны інспэктар Нарасьветы ў Магілеве, рашыў узьняць кваліфікацыю выкладчыкаў.

Выкладчык беларускай мовы накіроўваецца ў навуковую камандыроўку вывучэньня беларускай культуры ў... Сымфэропаль (зразумела, камандыроўка супадае з курортнай кампаніяй).

Выкладчык грамадазнаўства вывучае гэта ў Калінкавічах, Лепелі, агранамілі ў Ленінградзе, выкладчык педцыклю—у Прыяміне і г. д., а самаму дырэктару, вядома, трэба ведаць усё. І піша сабе літар: Гомель—Пяцігорск. Пяцігорск—Масква, Масква—Кастрама, Кастрама—Масква, Масква—Гомель.

Што можна вывучыць у Кастраме—ня ведаю, але аб Пяцігорску гаворыць, што гэта дасканалае курортнае месца. Але не заўсёды выгодна запаўняць ліцеры і паказваць у іх напрамак. Часамі прыходзіцца зьмяняць маршрут і Касьценіч знайшоў, што лепш узяць в канцылярыі чыстыя бланкі, а запоўніць іх заўсёды можна.

І адначасова з вышэйпамянёнымі ліцерам ён бярэ на ўсякі выпадак адзін не запоўнены. Запоўнены ваколь-свет ны ліцер аварочваецца «незапоўненым», але як скарыстаны другі—вядома аднаму Касьценічу. Ёсьць падстава думаць, што маршрут не зьмяняўся. Апроч таго, Касьценіч выпісываў сабе і 100-процантныя ліцеры незапоўненыя. Касьценіч гэтым не абмяжоўваецца, ён дае ліцеры асобам, ня маючым ніякіх адносін да тэхнікуму.

Напісаў «мэту паездкі»—вакацыі альбо «навуковая камандыроўка» і едзь куды хочаш.

Інспэктару палітасьветы трэба выдаць падпісаны, але не запоўнены ліцер, няхай у яго будзе на ўсякі выпадак, і яшчэ некаторым асобам.

Вучні і настаўн. атрымліваюць бясплатныя ліцеры і едуць на экскурсыі ў Батум. Чытач скажа, што 100 процантных ліцераў вельга выдаваць на экскурсіі, можна толькі льготныя, але трэба ўлічваць адлегласьць у Батум і назад ці хто з курсантаў ці настаўнікаў у стане нават плаціць і 50 процантаў.

Іншае пытаньне: ці трэба ехаць у Батум на экскурсію, але Касьценіч рашыў: у НК Асьветы больш грошай, чым у тэхнікуму, заплаціць.

Вось як Касьценіч раскідае дзяржаўныя сродкі.

Ёсьць у Касьценіча і іншыя дзівачнасьці. Ён ня любіў атрымліваць зарплату своечасова. Быў ён адначасова і дырэктарам рабфаку. Асыгнаваньні на ўтрыманьне апошняга адпускаліся з кастрычніка 1927 г., адчынен ён быў з 15 лістапада.

Зарплату ён сабе выпісвае з 1-га лістапада, але ў жніўні 1928 г. ён рашыў атрымаць і за кастрычнік 27 г. Так і зрабіў.

Першапачатковым каштарысам стаўка дырэктару рабфаку вызначана ў 45 руб., праз некалькі дзён, у кастрычніку 1927 г. атрымліваецца дадатковая стаўка, якой устанаўляецца ў 90 руб., але Касьценіч чамусьці і далей атрымлівае па 45 руб., а толькі 28 чэрвеня 1928 г. ён выпісвае сабе 327 руб. 96 кап. дадаткова зарплаты з лістапада па 45 руб. Зразумела, гэта яго права і Дзяржфінкантроль да гэтага пратэзіі мець ня можа, але гэта злыя языкі (зразумела, не кантроль) тлумачаць тым, што калі-б своечасова выпісваць зарплату па штомесячных ведамасьцях, а не па дадатковых, прышлося-б гэтыя грошы аддічыць, як звыш партмаксімуму, а ён атрымліваў досыць вялікую пэнсію: як дырэктар тэхнікуму—144 р., за выкладаньне каля 50 руб., як дырэктар рабфаку—90 р., а разам каля 300 руб.

М. Л. Кунін.

Хуліганы арудуюць.

У хутары Альхоўка (Прудзішчанскі с.-с., Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, Меншчына), арудуе хуліган Майсевіч Янка са сваім суседам Асіпчуком. Яны п'янымі ідуць на вечарынкі і абавязкова каго-небудзь паб'юць.

18 лістапада Майсевіч на вясельлі у Сямковых разьбіў бутэлькай галаву хлапцу Вардамскаму з в. Прысёлкі, а Асіпчук соваўся да хлаца Каханоўскага Рыгора.

Праз тыдзень 4 браты Майсевічы і 2 браты Асіпчукі разагналі ўсіх з вясельля і разьбілі бутэлькамі галаву Качану Кастусю з в. Рэбрышча.

Гэта адказ афіцыйны ў такой паважнай установе на ўсю акругу, у РСІ.

ЗА ЗУЕВА—ТОЛЬКІ ГАЗЭТА.

Ведаючы цану такім заявам, як Валынца, Вішнеўскага, Вішнеўскай, Красьнікава і інш., рэдакцыя аршанскае акруговае газэты патрабавала расьсьледаваць факты; вынікі досьледу відаць вышэй, за выключэньнем растраты ў 4.500 руб.

«Растратчыкам» Зуева зрабілі працаўнікоў у АКК РСІ як Вал пеп (якога, на шчасьце, зараз няма), Макаравіч (таксама няма) і Вішнеўскі, рабселькору дабра адтуль не чакай, бо акрамя нядбайных адносін да справы селькора Курганава, Валынец, будучы талы старшынёю АКК РСІ, на кожным сходзе, ці партыйным ці іншым, ліў самае брудное на Зуева, кажучы: «Я в поўнай адказнасьцю заяўляю, што Зуеў—растратчык, белагвардзеец, контрэвалюцыянэр і, наогул, дзівлюся, як гэта партыйны орган церпіць такога рабселькора?»

Падобныя «справачкі» на большменш шматлюдных сходах давалі: Вішнеўскі, Грабенчык, Вішнеўская, Красьнікаў, Пазьняк і інш. скапцоўская спачуваючая яму брація.

Хо гэтыя выдатныя паляўнічыя, пагаворым крыху ніжэй, а цяпер ня шкодзіць адзначыць афіцыйны адказ інспэктара РСІ (які, нажаль, і зараз займае гэтую пасаду) Вішнеўскага.

Да яго прышлі 2 прадстаўнікі ад мясцовай газэты «Камуністычны Шлях» і заявілі: зараз адбываецца працэс над злачынцам Скапцом; на гэтым працэсе цэлы шэраг адказных працаўнікоў акругі абвінавачвае Зуева, як селькора; называюць яго злачынцам і г. д. Лічым неабходным зьвярнуць на гэта ўвагу, прыпыніць зьдзекі над Зуевым, тым больш, што працэс над Скапцом, а не рэдакцыяй і яе рабселькорамі.

Вішнеўскі адказаў проста: „Зуев—контр-рэвалюцыянэр, белагвардзеец, растратчык на суму 4500 руб., і няма чаго вам хадайнічаць за яго".

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра змену пастановы ЦВК і СНК БССР „Аб парадку рэвізіцыі маемасьці прыватных асоб і таварыстваў".

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

Увесьці ў пастанову ЦВК і СНК БССР за 26 сакавіка 1927 году «Аб парадку рэвізіцыі маемасьці прыватных асоб і таварыстваў» (З. З. БССР 1927 г., № 17, арт. 71) наступныя змены:

I. Дадаць артыкул 2-а ў наступнай рэдакцыі:

«2-а. Калі домаўладальнік не згодзіцца з ацэнкаю, зробленай камісіяй, паказанай у артыкуле 2 гэтае пастановы, то па іску домаўладальніка спрэчкі па гэтым пытаньні паміж ім і акруговым выканаўчым камітэтам вырашаюцца судом».

II. Артыкул 3 запісаць у наступнай рэдакцыі:

„3. Устаноўленая камісіяй плата выдаецца акруговымі выканаўчымі камітэтамі к моманту фактычнага адабраньня маемасьці».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

27 сьнежня 1928 г., г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении постановления ЦИК и СНК БССР «О порядке ревизиции имущества частных лиц и товариществ»

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

Ввести в постановление ЦИК и СНК БССР от 26 марта 1927 года «О порядке ревизиции имущества частных лиц и товариществ» (С. З. БССР 1927 г., № 17, ст. 71) следующие изменения:

I. Дополнить статьей 2-а в следующей редакции:

„2-а. Если домовладелец не согласится с оценкой, произведенной комиссией, указанной в статье 2 настоящего постановления, то по иску домовладельца споры по этому вопросу между ним и окружным исполнительным комитетом разрешаются судом».

II. Статью 3 записать в следующей редакции:

„3. Установленное комиссией вознаграждение выдается окружными исполнительными комитетами к моменту фактического отобрания имущества".

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР М. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

27 декабря 1928 года. г. Минск.

Антысэміты перад пралетарскім судом

Допыт сьведкі Баршай.

Суд допытвае Баршай. Яна крыху хвалюецца.

Гэта маладая дзяўчына, з запужаным тварам.

Усе падсудныя імкнуліся даказаць, што Баршай абмежаваная, Баршай разумова-адсталы чалавек.

Але варта толькі паслухаць яе тлумачэньні адказы, як абуренае супроць зьдзеку, як адразу становіцца ясным, чаго дамагаліся падсудныя, імкнучыся выставіць Баршай нейкім ідыётам.

Баршай апавядае суду ўвесь працес зьдзеку, кпін, у гэтай справе прымалі чынны ўдзел Тачылін, Грудзоў, Тулякоў. Гэтая хоўра ніколі не давала ёй праходу, яны заўсёды лаялі яе брыдкімі словамі: «жыдоўская морда», «турка» ды інш. Але Баршай баялася скарэйшага на іх, бо яна ўмела гаварыць пабеларуску, апроч таго, падсудныя пагражалі ёй, калі яна пойдзе скардзіцца, што будзе яшчэ горш.

Гэта былі жарты, калі ёй падстаўлялі нагу, і яна падала і разьбівала сабе твар, гэта былі жарты, калі яе білі, жартавалі з ёю і тады, калі яе штурхалі, кідалі, рвалі адзеньне. А яна, Баршай, не магла ацаніць гэтых жартаў, а ціханька, забраўшыся ў куток, плакала ад болю і жалю.

Зьдзекаваліся з Баршай, калі яна дрэнна рабіла, груба лаялі яе і тады, калі яна і добра выконвала працу.

Чаму вас лаялі?—задае пытаньне т. Валасевіч.

— Таму, што я ўрэйка, што я ўмею гаварыць пабеларуску,—адказвае сьведка.

І бачылі, і зналі, і рабілі.

Працес цягнецца ўжо 3-ці дзень, аднак цікавасьць яго нікольки не паменшылася. Наадварот, допыт сьведак выяўляе новыя рысы, выплываюць новыя дэталі гэтай агіднай справы.

Суд дапрасіў ужо частку сьведак. Сьведкі Элентух, Рубінчык і Маргелін паказваюць суду, як яны прыбеглі на крык і енк Баршай і ўбачылі ўвесь агідны малюнак дзікага зьдзеку, аб якім ужо ня раз пісалася ў друку. Сьведкі сьцьвярджаюць, што Ніцеўская ліла ваду на аголенае цела Баршай...

Хуліганы і антысэміты Тачылін і Грудзоў нават былі пакрыўджаны тым, што перашкодзілі іх прыемным заняткам. Грудзоў груба заўважыў:—жыд за жыда заступаецца.

А міліцыянэр Красьнянскі, які спакойна глядзеў на гэтыя зьдзекі з Баршай, спакойна заўважыў:

— А што, мне на можна паглядзець на жыдоўскую...

Так крок за крокам суду ўдаецца сарваць з падсудных іллывае прытворства нічогаведаньня.

Дапрошаныя сьведкі паказалі, што на заводзе стварыліся нездаровыя нацыянальныя суадносіны паміж рабочымі яўрэямі і неяўрэямі.

— „Жыд", «мужык», «хам»,—кажа сьведка Пугачоў,—можна было чуць ад некаторых адсталых рабочых. Слабая пастаноўка культурна-масавай работы на заводзе, нячулыя адносіны адміністрацыі і партыйнага апарату спрыялі росквіту кветкі антысэмітызму на заводзе.

Ніхто-ж у свой час ня прыняў належных мер, каб спыніць распаўсюджваньне нацыянальнай варожасьці.

Хаты-чытальні ў дзень 21 студзеня.

21-га студзеня—дзень сьмерці нашага настаўніка У. І. Леніна. Хатамчытальням, чырвоным куткам гэты дзень неабходна адзначыць належным чынам.

Ужо зараз трэба вечарынамі наладжваць сярод сялянства галосныя чыткі літаратуры; газетных артыкулаў, прысьвечаных жыцьцю і працы Ўладзіміра Ільіча.

Апроч таго, кожная хата-чытальня, нарадом павінны арганізаваць выстаўку адпаведнае літаратуры і наладзіць прасоўваньне яе (творы У. І. Леніна, літаратура аб жыцьці і працы У. І.) праз кніганошаў, актывістых сялян і вучняў—у шырокім масы працоўных.

У самы дзень 21-га студзеня пры ўсіх нарадах, хатах-чытальнях, чырвоных куткох трэба правесьці вечары, прысьвечаныя жыцьцю і працы Ўладзіміра Ільіча.

Таксама памяшканьні памянёных устаноў неабходна прыбраць ленінскімі лёзунгамі, плякатамі.

Сьвяткаваньне дню 21-га студзеня павінна быць масавым пры ўдзеле ўсіх прапоўных.

Гэты дзень павінен стаць пачаткам сталага вывучэньня ўсяго таго, чаму вучыў і за што змагаўся Ўладзімір Ільіч, тым больш, што насельніцтва нашых глухіх вёсак яшчэ мала знаёма з вучэньнем У. І. Леніна.

Асабліва зараз і ў самы дзень 21-га студзеня паліт-асьвет установам неабходна павесьці шырокую кампанію сярод насельніцтва за падпіску на творы У. І. Леніна на беларускай мове, што зараз выдаюцца Беларускім Дзяржаўным Выдавецтвам у Менску.

Лікпункты і іншыя школы паліт-асьветы, апроч увязкі матар'ялу, прысьвечаных жыцьцю і працы Ул. І. Леніна з вучэбным матар'ялам, павінны прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і самым правядзеньні дню 21-га студзеня в бліжэйшымі паліт-асьветнымі ўстановамі.

М. Сеўрук.

ХРОНІКА.

Вызваленьне зьняволеных па маніфэсту Юбілейнай Сэсіі ЦВК.

Пры менскім папраўчым доме ўжо адбылося 4 пасяджэньні Менскай акруговай камісіі па ажыцьцяўленьню маніфэсту Юбілейнай Сэсіі ЦВК БССР. Разгледжана 288 спраў. З гэтай колькасьці камісія пастанавіла вызваліць 110 чал. і скараціць тэрмін каля 50 асуджаным.

Камісія будзе працаваць да 1-га лютага г. г.

Падрыхтоўка да ленінскіх дзён.

— У ленінскія дні ў хатах-чытальнях і нардамах адбудуцца вечары і гутарні, прысьвечаныя памяці Леніна, а таксама арганізуюцца выстаўкі ленінскай літаратуры.

Апрача гэтага, пры кожнай хаце-чытальні будуць утвораны гурткі па вывучэньню ленінізму.

Менскі акрэалітасьвет скамплектаваў некалькі ленінскіх бібліятэчак, якія разаслаў па хатах чытальных округі.

— У ленінскія дні ў гарадох будуць арганізаваны агульна-гарадзкія жалобныя пасяджэньні дзіцячага актыву з успамінамі аб Ільічы.

На школах запрапанавана фарпостам арганізаваць між 20 і 22 студзеня дзіцячыя ранішнікі, а ў піянэратрадах—жалобныя зборы атрадаў, прысьвечаныя 5-й гадавіне з дня сьмерці Леніна.

Запрапанавана прыстасаваць да гэтых дзён у атр дах перадачы лепшых піянэраў з дзяцей рабочых, батракоў і беднаты ў камсамол.

Па лепкутках Беларусі зараз праводзяцца гутарні з чырвонаармейцамі на тэмы: «Ленін і Чырвоная армія» і „5 год па шляху Леніна".

У піяніных клюбах і ў лепкутках арганізоўваюцца да ленінскіх дзён выстаўкі ленінскай літаратуры.

— У цэнтральным доме камсамолу адчыняецца вялікая выстаўка ленінскай літаратуры. Па габінетах будзе давацца кансультацыя па пытаньнях аб правядзеньні ленінскіх дзён.

— У ленінскія дні юнсэкцыі клюбаў наладжваюць вечары, прысьвечаныя 5-й гадавіне з дня сьмерці Леніна.

Гэтыя вечары адбудуцца і ў некаторых камсамольскіх ячэйках.

15-га сакавіка галянтарэйная фабрыка будзе пушчана.

Прэзыдыум ВСНГ Бел. пастанавіў скончыць усе будаўнічыя работы па пабудове галянтарэйнай фабрыкі ў студзені, а пусьціць яе не пазьней 15 сакавіка гэтага году.

Вынікі амністыі да 10-годзьдзя БССР.

Па адміністрацыйнаму аддзелу Менскага акрыканкому да 13 студзеня паводле амністыі да 10-годзьдзя існаваньня БССР з 419 чалавек складзены штрафы на 1918 р., з 37 чалавек зьнята 110 дзён прымусовых прац і спынена 224 розныя пратаколы.

У дапамогу чырвонай казарме.

Менскае кіраўніцтва вучасковага інжынера прымае актыўны ўдзел у правядзеньні агляду чырвонай казармы. З гэтай мэтай кіраўніцтва разьмеркавала сваіх тэхнікаў для ўдзелу ў агляде.

У № -скім страхавым палку Беларусі прыступлена да абсталяваньня чырвонаармейскай чайнай.

Беларуская інвалідная каапэрацыя адпусьціла свайму нацыянальному палку каля 300 руб. для здавальненьня патрэб казармаў.

Праверка беларусізацыі ў рабочых клюбах.

У бліжэйшы час у Менску пачнецца праверка беларусізацыі ў рабочых клюбах.

У першую чаргу будзе правесьдена праверка ў клюбах саўгандсаўжачых, мясцовых і чыгуначнікаў.

Асабліва ўвага пры праверцы будзе зьвернута в тое, ці ўжываецца беларуская мова ў жывой гутарцы наведвальнікаў.

Удзел жанчын у справаздачнай кампаніі гарсавету.

З мэтай большай падрыхтоўкі жанчын да справаздачна-перавыбарчай кампаніі менгарсавету на ўсіх прадпрыемствах зараз праводзяцца сходы жанчын, на якіх абгаворваецца пытаньне аб задачах жанчын у справаздачнай кампаніі. Гэткія-жа сходы адбываюцца ў палітгуртках, палітшколах і г. д.

Ва ўсіх насьпенных газэтах прадпрыемстваў, устаноў, клюбаў і жактаў на час справаздачна-перавыбарчай кампаніі будзе увезены куткі «Задачы работніц у перавыбарах гарсавету».

Першы ў БССР радыётэатр.

Цэнтральны радыёвяшчальны вузел адчыніў у Цэнтральным Доме Селяніна першы ў БССР радыётэатр.

Мэтай тэатру вынікненьня папулярызацыя сярод шырокіх мас музычнай культуры і ў прыватнасьці, дасягненьняў у беларускай музыцы.

Праграма тэатру складаецца з музычна-вакальных нумароў, хору і г. д.

Экскурсія рабочай моладзі ў Барысаў

Юнсэкцыя клюбу скурэйкаў арганізуе сёньня масавую экскурсію рабочай моладзі ў Барысаў. У экскурсіі прымуць удзел каля 100 чал.

Экскурсія наведае розныя фабрыкі і заводы Барысаву.

Барысаўская рабочая моладзь рыхтуе арганізаваную сустрэчу менскай рабочай моладзі.

Падрыхтоўка піанэрпрацаўнікоў.

Для падрыхтоўкі працаўнікоў сярод дзяцей, ЦК ЛКСМБ накіроўвае на ўсесаюзныя курсы піанэрпрацаўнікоў у Маскве 4-х чалавек.

Сярод іх прадстаўнікі ад Менскай, Віцебскай, Аршанскай і Мазырскай округ

Пашырэньне Менскага заводу „Камунар".

У куткім часе на менскім металёвым заводзе „Камунар" адчыняецца новы зборачны цэх.

Завод пачынае паступова пераходзіць да будаўніцтва машын. Атрымана заказ на выраб 160 каменядробілак. Раней гэтыя машыны ўвозіліся да нас з за межаў.

Зараз на заводзе працуе каля 410 рабочых. Да канца году на завод будзе прынята яшчэ 60 чал.

Будаўнічы цэх пры Цэнтральным інстытуце Працы.

Менская Біржа Працы давяла да ведама беспрацоўных, што з 20 студзеня г. г. адчыняецца пры ЦІП'е будаўнічы цэх па адрыхтоўцы рабочых будаўнікоў на сакуньні васьмых каменшчыкаў і тынкоўшчыкаў. Заявы падаюць сябры саюзу ў саюз саюзы, а беспарты саюзу і дэмабілізаваныя чырвонаармейцы сэкратару Біржы Працы.

Пачатак прыёму заяў з 17-1 29 г. Саюзы павінны прысылаць на Біржу Працы сваіх людзей не пазьней 20-1 29 г. к сэкратару Біржы Працы.

Зпідэмія грыпу зьмяншаецца.

Эпідэмія грыпу за апошнія часы значна зьмяншаецца. Зараз па Менску штодзень захворвае грыпам у сярэднім толькі 30 чалавек. Трэба адзначыць, што эпідэмія грыпу працякала без асабліва цяжкіх выпадкаў. Сьмяротных выпадкаў амаль не назіралася.

Барацьба з жабрацтвам.

Савнарком БССР адпусьціў Наркамсабезу 40 000 руб. на барацьбу з жабрацтвам і прастытуцыяй. З гэтай сумы Менскі акрсабес атрымае 10.000 руб. На гэтыя сродкі акрсабес зладзіць месцы ў дамох бяспрытульных на 50 чалавек. Будзе забаронена жабраваць па вуліцах. Жабракі-адзіночкі будуць рэгістраваны, а ў піянэратрадах—жалобныя зборы атрадаў, прысьвечаныя 5-й гадавіне з дня сьмерці Леніна.

Як ідзе збор старой паперы.

Яшчэ ў лістападзе мінулага году НКРСІ СССР выдаў пастанову аб эканомічным карыстаньні паперай і зборы паперовай макулатуры. Пастанова абавязвала ўсе ўстановы неадкладна пачаць выбіраньне макулатуры.

Што-ж зроблена цэнтральнымі ўстановамі БССР па ажыцьцяўленьню гэтай пастановы?—Вельмі мала што, на гледзячы на ад'ежную інструкцыю НКРСІ БССР.

У канцы сьнежня 1928 году цэнтраархіў атрымаў загад ад РСІ аб перагляде архіваў, якія ёсьць на ўстановах, і выняткі з гэтых архіваў непатрэбных паперы. Павінна была быць в дана цэнтраархівам спэцыяльная інструкцыя, на падставе як й установы маглі-б правесьці ня артаваньне лішніх паперы з архіваў. Гэтая інструкцыя дагэтуль не разаслана ўстановам, на гледзячы на тое, што тэрмін яе разасланьня ўжо мінуў.

Што-ж робяць са свайго боку ўстановы?

У ВСНГ Наркамасьветы, Наркампрацы ды інш. ёсьць шмат архіваў якіх нельга рэалізаваць бяз інструкцыі цэнтрархіву. Спажыванные паперы ў гэтых установах прыкметна зьменшылася. Паперовая сьмецьцьё, якое раней бяз толку зьнішчалася, зараз закоўваецца.

Уся гэтая лішняя папера, якая ў некаторых установах складаецца з шматгадовых мас, ляжыць пакуль-што бяз ужытка руку. Рэалізацыя гэтай паперы ўскладняецца тым, што непасрэдны яе спажывец—Белпапертрэст—адмаўляецца прымаць паперу інакш, як буйнымі партыямі, у 100 і больш пудоў.

Белпапертрэст апраўдваецца тым, што ня мае спэцыяльнага складу ў Менску для прыёму меншых партый паперы і хоча ўскласьці гэтую апрацоўку на Белдзяржгандаль ці Белкавпасаюз.

Выводы з усяго гэтага?—Іх павінны зрабіць Наркамгандаль і НКРСІ у сэнсе найхутчэйшага ўпарадкаваньня справы з рэалізацыяй паперы.

Неабходна адчыніць у Менску пры Папертрэсьце спэцыяльны склад для прыёму паперы і прысьпешыць разасланьне цэнтраархівам інструкцыі аб перадачы архіваў у фонд паперовай макулатуры.

Да ведама дэмабілізаваных беспрацоўных.

У апошнія часы назіраецца прыезд у Менск дэмабілізаваных беспрацоўных з іншых мясцовасьцяй, у той жа час на біржы ёсьць шмат дэмабілізаваных, якія працу ня могуць атрымаць. Прымаючы гэта на ўвагу, біржа працы папераджае, што прыехаўшыя ў Менск дэмабілізаваныя беспрацоўныя працы не атрымаюць і на вучот брацца ня будуць.

* * *

Да гэтага часу яшчэ ёсьць шмат дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, якім зараз працы даць нельга, а між тым нагляднена прыезд у г. Менск з іншых мясцовасьцяй Беларусі а таксама і з за межы БССР.

Біржа Працы папераджае, што прыехаўшыя ў Менск дэмабілізаваныя чырвонаармейцы ў Менску не атрымаюць працы і на вучот брацца ня будуць.

Пасылка дэмабілізаваных на працу.

У сучасны момант менская біржа працы вядзе перагаворы з адміністрацыяй чыгункі МБШ аб прыёме на працу на чыгунку 40 чал. дэмабілізаваных чырвонаармейцаў.

Ужо маецца дагаворанасьць з Менскай акруговай мілыцыяй аб прыёме на працу 25 дэмабілізаваных чырвонаармейцаў.

Апрача гэтага, у мэтах перакваліфікацыі дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, апошнія накіроўваюцца на працу ў будаўнічы цэх курсаў Цэнтральнага Інстытуту Працы.

СВОДКА № 5

аб ходзе перавыбараў сельсаветаў у 1929 годзе ў параўнаньні з зьвесткамі 1926 27 г.

(Весткі даюцца па 42 раёнах па тэлеграфу па становішчы на 16 студзеня 1929 г.).

	1928 29 г.	1926-27 г.
1) Перавыбрана	103 сельсаветаў	—
2) Ліч насельніцтва ва ўзросьце 18 і звыш год	159546 чал.	—
3) З іх пазбаўлена выбарчага права	3141 „ 2,0 ср.	1,4 проц.
4) Агульны лік выбаршчыкаў	156432 „ 98,0 „	98,6 „
5) З іх: жанчын	79634 „ — „	—
6) Зьявілася на выбары: усяго	85574 „ 54.7 „	46 3 „
7) З іх: жанчын	30375 „ 38.1 „	26,4 „
8) Усяго выбрана членаў сельсаветаў	2172 —	—
9) З іх: жанчын	638 „ 20,1 „	7,2 „
10) Па партыйнасьці:		
а) камуністаў	250 „ 7,9 „	9,3 „
б) камсамольцаў	312 „ 9,8 „	9,0
11) Па нацыянальнасьці:		
а) беларусаў	2937 „ 92,6 „	91,5 „
б) яўрэяў	90 „ 2,8 „	2,2 „
в) расейцаў	40 „ 1,3 „	2,6 „
г) палякаў	75 „ 2 4 „	2,2 „
д) іншых	30 „ 0.9 „	1,5 „

Навука і тэхніка.

Перадача малюнкаў па радыё.

На цэнтральным тэлеграфе ў Ленінградзе пачалася ўстаноўка першага радыёапарату „Тэлефункен-каролус" дзеля перадачы малюнкаў па радыё на адлегласьці. Праз гэты апарат можна перадаваць фатаграфію, вэксаль, дакументы і г. д. памерам 10 сантыметраў шырыні і 20 даўжыні. Перадача робіцца з фатаграфскай праўдзівасьцю.

Малюнкі праз гэты апарат будуць перадавацца паміж Ленінградам і Масквой.

Установка апарату скончыцца тымі праз два. Перадача малюнкаў будзе прымацца ня толькі ад установы і арганізацый, але і ад прыватных грамадзян. Таксама за перадачу зараз апрацоўваецца.

Радыёфікацыя СССР.

Нар. Кам. пошты і тэлеграфу распіў радыёфікаваць сёлета 16.000 населеных пунктаў Савецкага Саюзу. Асабліва цікавы спосаб радыёфікацыі вёскі: у аднай з хат будзе абсталявана цэнтральная прыёмная станцыя з узілічэнем і алтуль перадача на ўсіх хатах вёскі будзе рабіцца па дроце.

У шэрагу гарадоў—у Маскве, Ленінградзе, Нижэгін-Ноўгарадзе і інш.—будуць адчынены новыя майстэрні дзеля вырабу радыёабсталяваньня.

Жалеза-бэтонныя чаны для нафты.

Да гэтага часу запасы нафты трымалі вычэўна ў жалезных і сталёвых чанах. З 1923 году ў Паўн.-Амэр. Зл. Штатах пачалі будаваць жалеза-бэтонныя чаны.

Адна з нафтавых кампаній у Каліфорніі зараз будуе агромадны жалеза-бэтонны чан аб'ёмам у 24 мільёны куб. метраў.

Часта здараецца, што нафта загараецца ад накаленьня ў чане грымучага газу, а таму ў новым чане маркуецца месца паміж нафтай і вакам запоўніць якім-колечы агнеўпартым газам.

Спосаб паратунку для аэраплянаў.

На самалётах паветранага флёту Паўн.-Амэр. Зл. Штатаў уводзіцца новы апарат дзеля паратунку ў выпадку няшчасьця з самалётам.

Гэты апарат уяўляе сабой аграмадзны мяшок з прарэзіненай тканіны. Складзены ён займае зусім мала месца на самалёце.

Ён злучан трубачкай з бакам, у якім ёсьць сьпёрты газ. Гэты газ можа напоўніць мяшок у адзін міг, толькі трэба павярнуць рукаятку.

Такі мяшок, надуты газам, можа ўтрымаць на ваду аэраплян, з якім здарылася няшчасьце над акіянам.

Радыётэатр у Ленінградзе.

У Ленінградзе в посьпехам пачаў працаваць першы ў СССР радыётэатр. Спэцыяльна абсталяваная заля тэатру дае магчымасьць выразных і ясных перадач па радыё.

Зараз рэгулярна два разы на тыдзень у тэатры налажываюцца канцэрты лепшых артыстых Саюзу.

У выязку з вялікім посьпехам радыётэатру ў Ленінградзе такіх-жа тэатры будуць абсталяваны і ў буйных гарадох СССР.

У Маскве радыётэатр будзе абсталёван у новым будынку Нар. Кам. пошты і тэлеграфу. Зараз абсталёўваюцца радыётэатры ў Харкаве і Тыфлісе.

Аўтамабілі для перавозкі атрутных газаў.

Французкае ваеннае міністэрства ўжыве новы тып аўтамабіляў дзеля перавозкі атрутных газаў. Такі аўтамабіль мае брызіраваны бак, у які пад вялікім ціскам накачваецца атрутны газ.

На аўтамабілях новага тыпу можна зазнаёміць хутчэй падвозіць атрутныя газы да месца атакі.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Групком № 2 саюзу працасьветы гор. Менску паведамляе ўсіх сяброў 2-га групкому і сяброўкасы ўзаемадапамогі, што ў суботу 19 га студзеня, а 6 гадз. увечары, у памяшканьні дому асьветы адбудзецца агульны сход сяброў.

Абвестка дню:

1) Адчот дэпутатаў гарсавету аб іх працы. 2) Адчот бюро касы ўзаемадапамогі і выбары новага бюро і рэвізійнай камісіі. 3) Бягучыя справы.

Яўка сяброў абавязкова.

ПЭДГАБІНЭТ.

— Сёньня, 18-1 29 г. а 7 гадз. увечары сход загадчыкаў сямігадовых школ. У парадку дню—даклад інспэктара ПКА т. Жигмунта аб камітэтах дваімогі школе.

— У суботу. 19-1, а 7 гадз. увеч. адбудзецца пасяджэньне акруговай мэтадычнай камісіі.

На абвестцы дню:

1. Мерапрыемствы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню ў школах—дакл. Розін.

2. Мерапрыемствы па антырэлігійнаму выхаваньню ў школах—дакл. Губар і Качуры.

Запрашаюцца настаўнікі школ г. Менску.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 6 Менскага Гарадзкога Савету.

17 студзеня 1929 г.

У дні—галавіны сьмерці У. І. Леніна, 21-га студзеня і „9-га студзеня 1905 г."—22-га студзеня, Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

1. Зачыніць 21-га і 22-га студзеня ўсе месцы для забаў і відовішчы і звязіць у гэты дзень на 10 хвілін (пачынаючы ад 18-ці гадз. 20 хв. да 18 гадз. 30 хв.) дзяржаўныя сьцягі, узьнятыя над установамі і прадпрыемствамі.

2. Гандаль дзяржаўны, каапэрацыйны і прыватны спыніць з 18 гадзін (а ў харчовых крамах—з 20 гадз.) 21-га студзеня і на ўвесь дзень 22 студзеня, за выключэньнем наступных магазынаў, якія могуць быць адчынены ў аўторак 22-га студзеня:

А. Ад 9-ці да 17 гадзін без перапынку.

1) МЦРК № 6 Скураная вул., д. № 7-а
2) « № 11 Рог Савецкай і Камароўскай вул. д. № 2;
3) « № 24 Рог Сьвярдлоўскай і вул. К. Маркса. д. № 15/1;
4) « № 39 Савецкая вул., д. № 92;
5) « № 40 Ленінская вул, № 1.
6) Працалектыў пекароў, маг. № 1, Камунальн. вул. д. № 14/18;
7) « « « № 2, Савецкая вул. д. № 76;
8) « « « № 8, В.-Татарская вул. д. №15/1;
9) Інваліды. арцелі „Перамога", маг. № 5. Савецкая вул., д. № 35.

Б. Ад 9-ці да 12 гадзін.

10) Сельска.-гаспад. калён. „Зорка" № 2 Інтэрнацыянальн. в. № 2.
11) Фермы „Прылукі-Аталіна", Ленінская вул., д. № 28;
12) Інваліднай арцелі «Перамога» № 4, Савецкая, д. № 62;
13) Усе магазыны МЦРК гандлюючыя малаком, а іменна: №№ 60, 41, 31, 22, 55, 50, 34, 9, 8, 32, 42, 29, 38, 10, 96, 83, 109 і ларкі №№ 11, 8.

3. Кафэ рэстараны, піўныя, закусачныя і сталоўкі зачыніць з 18 гадз. 21 студзеня і на ўвесь дзень 22 студзеня, за выключэньнем сталовак МЦРК:

а) № 1 Інтэрнацыянальная вул, № 8;
б) № 2 Рог Савецкай вул. і Энгельса, д. № 24/85;
в) № 6 Ленінская вул., д. №119;
г) № 8 Савецкая вул., д. № 69, якія могуць быць адчынены: першыя 3 ад 9 да 18 гадзін, а апошнія ад 9 да 24 гадзін.

Увага: 21-га студзеня сталоўкі МЦРК і ТПО МБШ чыгункі могуць быць адчынены, як у звычайныя дні.

4. Працу ў прадпрыемствах за выключэньнем тых, якія ня могуць быць зачынены спыніць не пазьней 18 гадз. 21-га студзеня і на ўвесь дзень 22-га студзеня.

5. Працу у цырульнях і фатаграфіях спыніць з 18 гадз. 21-га студзеня і на ўвесь дзень 22-га студзеня.

6. Дазволіць 20 і 21 студзеня працу ва ўсіх цырульнях і фатаграфіях і гандаль ва ўсіх крамах без падзьвённага перапынку.

7. Дазволіць гандлёвым прадпрыемствам, якія маюць выхадны дзень кідзелі гандляваць 20-га студзеня.

8. Нагляд за выкананьнем гэтае абавязковае пастановы ўскладзецца на міліцыю.

9. Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы караюцца ў адміністрацыйным парадку: штрафам да 100 р. ці прымусовымі работамі да 1-го месяца.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету Яцкевіч.

Сакратар Менскага Гарадзкога Савету Пасынкоўскі.

КІНО-ТЭАТР.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
ПЯТНІЦА, 18 СТУДЗЕНЯ
САЮЗУ МЭДСАНПРАЦЫ
„НАД НЁМНАМ".
Пачатак а 8 гадзіне вечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». 3 аўторка 15 студзеня. Мастацкі баявік. Межрабпом-фільм. Масква—Праматэус Бэрлін. „Саламандра". У галоўн. ролі Бэрнгард—Гэтцке.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". 3 аўторка 15 студзеня. „Сапраўдны джэнтльмэн". Зьвыш праграмы—КІНО-ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО № 47.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка, 15-га студзеня 1) „Апошні рэйс" 2) „Каханьне і спорт"

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. З аўторка 15 студзеня. 1) „Брэмяносец Пацёмкін" 2) „Ася". Пачатак а 7 гадзіне.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». (Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»). „ВАСЯ РЭФАРМАТАР" у 6 частках. Кошт білету 10 кап.

КАНТОРА ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" апавяшчае падпісчыкаў, што

РОЗЫГРЫШ ЛЁТАРЭІ

АДБУДЗЕЦЦА 20 студзеня 1929 г. а 12 гадз. дню ў памяшканьні рэдакцыі газэты. Запрашаюцца ўсе жадаючыя прысутнічаць.

Народны Суд Клімавіцкага райёну выклікае яшчэ ў суд, або паведаміць свой адрас гр-на Панцялеева Сьцяпана Зьмітравіча 36 гадоў, які ў апошні час працаваў судовым выканаўцам 5 вуч. Магілёўскай округі і жыў у гор. Клімавічах. Таксама суд просіць асоб, якія ведаюць адрас Панцялеева, паведаміць аб гэтым суд.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Асабовае пасьведчаньне Шаніра І. С. выд. мхаўскім РВК, кв. 251.
— іржавы талён Грузман Г. С., выд. Біржай Працы, кв. 252.
— Асабовае пасьведчаньне Кулінякіна Е. выд. Брагінскім с.-с. Гомельск. раёну, кв. 253.
— Справка аб пісудзімасьці, выд. Крымшыку на імя Зісьмана 7. М., кв. 254.
— Сяброўскі білет № 148 Смяк Я. Я., выд. Заслаўск. райкомам саюза прац. землі і лесу, кв. 255.
— 4 біржав. талёны Кантаровіч М., выд. Менбіржай Працы, кв. 256.
— Пасьведчаньне № 167 Гольлера Я. Я., выд. ДУ, кв. 25.
— Паявая кніжка № 6370 Гразноўскага Г. Н., выд. арэкаўскім Ц К, кв. 258.
— Закладны квіт на краму Стронгіна І., выд. арысаўскім кам. гаспад. на суму 10 руб., кв. 259.
— Каапэрац. кніжка № 9923 Рамашэўскага І. выд. МЦРК, кв. 261.
Заборная кніжка № 5766 Людзінавай Н. К., выд. Барысаўскім ЦК. кв 245.
— Лекавая кніжка Дайнеко П., выд. Барысаўскай страхкасай, кв. 246.
— Вучотна-конская карт. Трафімава І. гр. вёскі Кузьмічы, Каралінскага райёну, кв. 247.
— Паявая кніжка № 41 Шухмана І. Ш., выд. Бобрыскім спаж. т-вам, кв. 248.
— паявая кніжка № 1009 Мігаль М., выд. Бобрыскім спаж. т-вам, кв. 248.
— Дапрызыўная карт. Мігаль В. Ц., выд. Крупскім РВК, кв. 248.
— Конская карт. № 46 Барбота Л., выд. Крупскім РВК, кв. 248.
— Сяброўская кніжка № 15945 Кножка А., выд. Аршанскім учрофсожам, кв. 248.
— Каапэрац. кніжка Крукоўскага П. Ю., выд. МЦРК кв. 249.
— Каапэрац. кніжка № 23526 Мазельсон А. Я., выд МЦРК, кв. 250.
— Студэнцк. пасьведчаньне за № 155 Варабёвай Э. К., выд. БДУ, кв. 299.
— Каапэрац. кніжка № 10963 Вербіцкага В. Л., выд МЦРК, кв. 300.
— Каапэрац. кніжка № 15376 Ігнатовіч І. С., выд. МЦРК, кв. 301.
— Конская кніжка № 351 Шыбанко І. Б., гр. в. Юзэфава Брадоўскага с-сав., кв. 302.
Сяброўская кніжка за № 491-503 Місевіча Я. Л., выд. Мазырск. с-гаспа. крэд. т-вам кв. 303.
— Сяброўскі білет № 157951 Нараўлянскага І. Н., кв. 304.
— Сяброўскі білет № 63712 Крачкоўскай М., выд. Барысаўск. саюзам працаўн. зямлі і лесу, кв. 305.
— Закладны квіт на суму 12 р. Уцюўскай Э. Х., выд. Мазырск. кам. гаспадарк., кв. 306.
— Заборная кніжка № 5446 Залатавіцкі, ЦРКўск. кв. 30д. Барыса7. кай,
— Сяброўская кніжка № 1237 Сібальдзі Е. А., выд. Мазырскім ЦРК, кв. 308.
— Сяброўская кніжка № 2563 Васэрмана А. Б., выд. Мазырскім ЦРК, кв. 309.
— Сяброўская кніжка № 2648 Дзекова Б. К., выд. Мазырскім ЦРК, кв. 310.

Загатоўкі трэба ўзмацніць.

Першае, што кідаецца ў вочы у вакандальні загатоўчых планаў гэта тое, што сёлета Белдзяржгандаль адстае ад сваіх калег.

Амаль па ўсіх асноўных відах тавару, якія ідуць на экспарт, Белдзяржгандаль пры сваім пазрактыкаваным апарадзе павінен быў ісьці першым, але ідзе ў хвосьце.

Возьмем, напрыклад, шчаціну—адзін з асноўных відаў тавараў; Белдзяржгандаль выканаў 4,8 проц. плану, Белсельсаюз—13 проц., а Белкавпасаюз—14 проц. Па пушніне Белдзяржгандаль выканаў плян на 12,4 проц., Белсельсаюз—на 25,3 проц., Белкавпасаюз—на 51,9 проц., Бел. палаўнічы саюз—на 18,8 проц. Па лёну—Белдзяржгандаль выканаў 42 проц. пляну, Белсельсаюз—39 проц., а Белкавпасаюз 94,8 проц. Па лёнавасеньню—Белдзяржгандаль—82.7 проц., Белсельсаюз—75 проц. а Белкавпасаюз—136